

«...ГЛЯДЗІ І ДУМАЙ, ПАКУЛЬ ЖЫВЕШ» 19

З ВАШАГА РАХУНКУ НЕ ЗНІКНУЦЬ ГРОШЫ? 21



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

15 СТУДЗЕНЯ 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 7 (29376)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

+TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вячаслаў ШЫЛА, старшыня Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў аховы здароўя**

*«Вызваленне работнікаў ад працы на тры дні без бальнічнага паменшыць нагрузку на паліклінікі. Што датычыцца лёгкіх формаў вострых рэспіраторных вірусных інфекцый, часам дастаткова аднаго дня, каб папячыцца, не наведваючы паліклінікі. Мы тым самым разгружаем медустановы, каб не было чэргаў. Акрамя таго, такая мера дазволіць знізіць захворванне на прадпрыемствах, у калектывах. Чым менш будуць хварэць работнікі, тым вышэй эфектыўнасць работы прадпрыемства. Між тым, важна, каб гэта права рэалізоўвалася на даверы паміж наймальнікам і работнікам».*

# ПАМІЖ БЕЛЫМІ БЕРАГАМІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На паўднёвай ускраіне Слуцка, там, дзе рака Случ робіць павольны паварот, гэтымі днямі можна назіраць, як у атачэнні рыбакоў плыве лебядзіная сям'я.

## КОРАТКА

- **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў рэдакцыі «Сельской газеты» са 100-годдзем з дня выхаду першага нумара.**
- Камп'ютарныя тамографы прыбудуць у бальніцы Ліды, Нясвіжа і Наваградка.
- **У Беларусі падрыхтавалі ілюстраванае выданне пра 1183 крыніцы.**
- Нацыянальны банк Беларусі акрэдытаваў і ўключыў у рэестр рэйтынгавых агенцтваў таварыства з абмежаванай адказнасцю «БІК Рэйтынгс».
- **Стыпендыі Прэзідэнта Беларусі назначаны 69 перспектыўным аспірантам.**

ISSN 1990 — 763X

Віншуем!

## Жывой сувязі чытачоў і «Сельской газеты» — 100 гадоў



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

**Такая дата — добрая нагода, каб падвесці пэўныя вынікі, азірнуцца і зразумець, што было зроблена, а над чым яшчэ трэба папрацаваць. Мы пагутарылі з галоўным рэдактарам выдання Сяргеем МІХОВІЧАМ і даведаліся пра тое, якія сюрпрызы падрыхтаваныя для чытачоў у святочны дзень, якія тэндэнцыі задае газета, якім матэрыялам не месца на друкаваных старонках і пра многае іншае.**

СТАР. 5

Тэма

## КАЛІ МАЦІ ЯК ДЗІЦЯ,

### або Як пасябраваць з самымі роднымі людзьмі, якія на старасці гадоў сталі асаблівымі



islam.ru

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

СТАР. 20

З першых вуснаў

# «У НАШАЙ КРАІНЕ ПРАВА НА АХОВУ ЗДАРОЎЯ НЕПАРУШНАЕ»

**На нарадзе ў Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі па ўдасканаленні сістэмы аховы здароўя разглядзелі змены ў законы «Аб ахове здароўя» і «Аб аказанні псіхалагічнай дапамогі». Гэтыя базавыя дакументы вызначаюць прававыя асновы аказання медыцынскай дапамогі насельніцтву. Па словах кіраўніка краіны, законы комплексна не пераглядаліся каля дзесяці гадоў — за гэты час адбылося шмат змен у медыцыне, навуцы і грамадскім развіцці.**

«Прыйшоў час актуалізаваць палажэнні закона. З іншага боку, калі пачыналася гэтая праца, ніхто не мог прадбачыць, што выбухне сённяшняя хвароба (пандэмія каранавіруса. — **«Зв.»**). Яна не толькі ўнесла сур'ёзныя карэктывы ў нашы планы, але і паказала, што ***айчынная ахова здароўя у цэлым гатова адэкватна рэагаваць на новыя выклікі»***, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заявіў, што перш за ўсё хацеў бы пачуць, як у новым законе захаваны нормы, якія дазваляюць кіраваць сферай і аказваць якасную медыцынскую дапамогу.

«Сістэма аховы здароўя павінна і надалей быць забяспечана ўсім неабходным, — падкрэсліў кіраўнік краіны. — ***У нашай краіне права на ахову здароўя, як вы разумееце, непарушнае. Бясплатнае і эфектыўнае лячэнне ў дзяржаўных установах аховы здароўя павінен атрымліваць кожны грамадзянін Беларусі».***

Прэзідэнт адзначыў: дзяржава са свайго боку абавязана захаваць усе ўмовы, каб у бальніцы было сучаснае медыцынскае абсталяванне, ва ўрача — сродкі індывідуальнай аховы, а пацыент, дзе б ён ні жыў (у сталіцы ці ў сяле), атрымліваў дапамогу, у якой мае патрэбу.

«Аднак пры ўсім гэтым відавочна, што нам неабходна абнавіць шэраг заканадаўчых палажэнняў. Гэта дазволіць ахове здароўя быць сучаснай і рухацца наперад», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён звярнуў асаблівую ўвагу, што падчас нарады неабходна атрымаць адказы на пытанні: якія вынікі аналізу тэндэнцый, што існуюць? Якімі напрамкамі ў развіцці медыцыны прадыктавана абнаўленне нормаў? «Трэба нам гэта ці не, і навошта?»

Паводле яго слоў, нельга абыходзіць пытанні, без вырашэння якіх немагчыма захаваць здароўе насельніцтва. Развіццё фізічнай культуры і спорту, экалагічная бяспека, магчымасць карыстацца аздараўленчымі ўстановамі і ўдасканаленне аховы працы — напрамкі, якія таксама павінны быць забяспечаны прававымі механізмамі.

***«Як бы ні мяняліся нормы, трэба памятаць, што ў цэнтры намаганняў медыкаў заўсёды чалавек. Выратаваць яго, захаваць і палепшыць яго здароўе — вось першачарговыя нашы задачы. Нязменны прыярытэт аховы здароўя — забяспечыць даступную і якасную медыцынскую дапамогу насельніцтву»***, — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

## ❍ Каментарый у тэму

### Прэзідэнт ухваліў закон «Аб ахове здароўя»

Пра гэта журналістам пасля нарады паведаміў **міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ.** Таксама кіраўнік ведамства падрабязна нагадаў, якія навацыі прадугледжаны законам.

Першае абнаўленне, на якім засяродзіў увагу міністр, — удасканаленне сістэмы кантролю якасці аказання медыцынскай дапамогі, уносіцца сістэма экспертызы і кіраванне якасцю медыцынай дапамогі.

Другі кампанент — новая фармакаэканамічная экспертыза, якая будзе вызначаць найбольш эфектыўныя методыкі аказання дапамогі ў медустановах.

«Важная навацыя заключаецца ў тым, што ў дзённых стацыянарах будзе аказвацца бясплатнае прадастаўленне лекавых прэпаратаў і вырабаў медпрызначэння. Гэта дасць другое жыццё нашым стацыянаразамяшчальным тэхналогіям. Ужо не трэба будзе класціся на кругласутачныя ложкі, а можна атрымаць вялікі спектр медыцынскіх умяшальніцтваў на ложках дзённага стацыянара», — сказаў Дзмітрый Піневіч.

Акрамя таго, ён паведаміў пра ўвядзенне формы кантралюемага лячэння, якое адбываецца пад кантролем медыцынскіх работнікаў у амбулаторных і стацыянарных умовах. Гэты варыянт прымяняецца для хворых на туберкулёз, ВІЧ.

«Кантралюемае лячэнне будзе прызначацца і пры іншых захворваннях, у прыватнасці гепатыт С, рассеяны склероз. Я хачу нагадаць: тыя захворванні, лячэнне якіх яшчэ пяць гадоў таму мы не разглядалі ў якасці бясплатнай дапамогі, зараз уваходзяць у стандарт аказання меддапамогі на бясплатнай аснове», — дадаў кіраўнік ведамства.

Звярнуў ён увагу і на павышэнне сістэмы паслядыпломнай падрыхтоўкі кадраў — уводзіцца паняцце рэзідэнтуры. Гэта павысіць якасць адукацыі і аб'ём ведаў спецыялістаў.

«У Гродне мы працуем над пілотным праектам універсітэцкай клінікі. Ён паказаў на першым этапе сваю эфектыўнасць, таму з'явілася дэфініцыя ўніверсітэцкай клінікі, якая дазваляе нам яе разглядаць не як пілотны праект, а праграму дзеяння. Там практыкаарыентаванасць становіцца галоўнай у адукацыйным і лячэбным працэсе», — патлумачыў Дзмітрый Піневіч.

Па яго словах, у 2023 годзе запрацуе адзіная электронная платформа сістэмы аховы здароўя, якая будзе даваць шмат магчымасцяў па абмене інфармацыяй. У тым ліку кожны пацыент будзе мець свой віртуальны кабінет.

Акрэдытацыя — навацыя, што запатрабуе адладжвання сістэмы патрабаванняў да медустаноў.

Уводзіцца права на прафесійную рызыку медработнікаў пры выкананні ўмяшальніцтваў.

«Любое медыцынскае ўмяшальніцтва, асабліва складаная аперацыя, трансплантацыя, радыкальныя аперацыі цягнуць за сабой рызыку ўскладненняў. У нас гэта называецца запраграмаваныя рызыкі, — канстатуе кіраўнік ведамства. — Цяпер адказнасць кладзецца на медустанову, якая абавязана забяспечыць мінімізацыю рызыкі».

Таксама міністр нагадаў, што медыцынская сістэма не дала збой у ковідны сітуацыі. І ўжо пачалося перапрафіляванне ложкавага фонду на звычайную работу. Так, у Мінску планава запрацаваў раддом № 2, перасталі шпіталізаваць ковід-хворых у гінекалагічную бальніцу сталіцы. Рэабілітацыйны цэнтр у Аксакаўшчыне напалову перайшоў на рэабілітацыю пацыентаў пасля аперацый.

«Вельмі хочацца займацца той работай, што займаліся да пандэміі», — падзяліўся Дзмітрый Піневіч.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА РАЗВІТАЎСЯ З МІТРАПАЛІТАМ ФІЛАРЭТАМ

**Прэзідэнт учора раніцай перад нарадай у Палацы Незалежнасці прыехаў у Свята-Духаў кафедральны сабор развітацца з мітрапалітам Філарэтам, ганаровым Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі, які пайшоў з жыцця.**

На цырымоніі развітання Прэзідэнта сустрэў мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.

Развітацца з мітрапалітам Філарэтам у Свята-Духавым кафедральным саборы можна было ўчора да вечара. Пасля труна з целам спачылага была перавезена ва Успенскі сабор Жыровіцкага мужчынскага манастыра. Сёння раніцай у манастыры пачнецца саборная архірэйская Боская літургія, пасля заканчэння якой адбудзецца паніхіда. Пасля паніхіды цела спачылага мітрапаліта Філарэта будзе пахавана за Крыжаўзвіжанскім храмам Успенскага Жыровіцкага манастыра.

## ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ НАКІРАВАЎ СПАЧУВАННЕ РОДНЫМ І БЛІЗКІМ ЛЕАНІДА ШЧАМЯЛЁВА

«Свой лёс ён звязаў з выяўленчым мастацтвам, аддаўшы ўсе душэўныя сілы, талент і натхненне. Творчасць майстра — неацэнны ўклад у гісторыю нацыянальнай культуры, духоўную скарбніцу Беларусі», — гаворыцца ў спачуванні.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што народны мастак Беларусі Леанід Шчамялёў выхаваў некалькі пакаленняў таленавітай моладзі і стаў прыкладам самаадданага служэння мастацтву і сваёй краіне.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Блізкая ўлада

# Аператыўна і вынікова

## Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла прамую лінію



**Тэлефон спікера верхняй палаты парламента традыцыйна ў гэты дзень не змаўкае ні на хвіліну: шмат званкоў з розных рэгіёнаў краіны, шмат пытанняў, якія хвалююць людзей і патрабуюць узважанага падыходу ды карпатлівага вывучэння. І гэта зразумела: да старшыні Савета Рэспублікі часта звяртаюцца як да апошняй інстанцыі, калі ўсе магчымыя крокі ўжо зроблены... Не стала выключэннем і гэтая прамая лінія — некаторыя з агучаных пытанняў стануць аб'ектамі для больш глыбокага вывучэння не толькі профільнымі міністэрствамі і ведамствамі, але і членамі Прэзідыума Савета Рэспублікі.**

Напрыклад, Алена Іванаўна закранула балючую тэму, добра вядомую на Міншчыне, якая датычыцца якасці рамонту і стану дарог. Яна расказала аб участку шашы ў Дзяржынскім раёне, які даўно патрабуе ўвагі з боку дарожных службаў: грэйдзіраванне не дапамагае палепшыць сітуацыю, ямы і выбоіны перашкаджаюць мясцовым кіроўцам.

Безумоўна, аб магчымасці аператыўна вырашыць праблему ў хуткім часе заяўніцу праінфармуюць адпаведныя органы ўлады, але вывучыць сітуацыю з выездам на месца даручана таксама намесніку старшыні верхняй палаты парламента Анатолію Ісачанку.

Дарэчы, не так даўно падчас правядзення грамадскай прыёмнай да члена Прэзідыума Савета Рэспублікі Сяргея Сіўца з аналагічнай праблемай звярнулася жыхарка вёскі Анопаль Мінскага раёна Анастасія Ціханава, маладая маці дваіх дзяцей. Яе запыт накіравалі ў мясцовае ДРБУ, якое хутка направіла становішча: цяпер там пакладзены асфальт і мясцовыя жыхары задаволены. Аб чым, між іншым, яны і праінфармавалі ў падзячным лісце, накіраваным на адрас старшыні Савета Рэспублікі.

І гэта не адзіны прыклад удзячнасці, якую выказваюць заяўнікі пасля вырашэння іх праблем з удзелам сенатарскага корпуса. Так, напрыклад, адбылося і з фермерам з Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці, з якім доўгі час не маглі разлічыцца некаторыя суб'екты гаспадарання за адгружаныя збожжа і бульбу.

Як расказаў карэспандэнту «Звязды» Лявонцій Гарудка, з гэтай праблемай ён звярнуўся падчас прамой лініі, якую праводзіла старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Тацццяна Рунец.

— Калі б не званкі з Мінска, даўгі маглі б «завіснуць» надоўга, — перакананы ён. — А мне ж трэба па перадаплаце разлічвацца са сваімі пастаўшчыкамі за ўгнаенні, паліва і гэтак далей.

Таму аператыўнае вырашэнне гэтага балючага пытання фермера вельмі ўсцешыла, чым ён і падзяліўся ў электронным звароце да Наталлі Качанавай, у якім падзякаваў сенатарскаму корпусу за дапамогу.

На сённяшняй прамой лініі таксама ў асноўным былі агучаны праблемы з разраду «накіпела»: у жыхаркі Гомельшчыны доўгі час цягнуцца непаразуменні з мясцовымі ўладамі наконт размяшчэння агароджы; пінчанка паскардзілася на адсутнасць аб'ёму работ на прадпрыемстве, у якім працуе; шматдзетная маці з Жыткавіч прасіла пасадзейнічаць у працаўладкаванні, а пенсіянеры з Брэста скардзіліся на дарагоўлю лекаў.

Між іншым, праблемы людзей і іх клопаты заўсёды знаходзяцца ў цэнтры ўвагі ўладаў, таму і ўсе ўзнятыя падчас сённяшняй прамой лініі пытанні будуць дасканала вывучаны і разгледжаны з удзелам адказных асоб.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

Будзьце пачутыя!

## КАБ ПРАБЛЕМЫ ВЫРАШАЛІСЯ ХУТЧЭЙ

**Для павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму, цяганіны і папяратворчасці, а таксама для аператыўнага рашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей, арганізавана штотыднёвае правядзенне аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам прамых ліній. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі **ў суботу, 16 студзеня, з 9.00 да 12.00** правядуць:

намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ (80162213121),

кіраўнік спраў Віцебскага аблвыканкама Алена Уладзіміраўна СЫСОЕЎ (80212222222),

кіраўнік спраў Гомельскага аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ (80232331237),

намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА (80152735644),

кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ (80175004160),

першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Васілевіч УЛАСЕВІЧ (80222501869),

першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Дзмітрый Міхайлавіч МІКУЛЁНАК (80172224444).

У пошуку шляхоў




# «Эвалюцыйны падыход — адзіны правільны рэальны інструмент»



— Усебеларускі народны сход сёлета праводзіцца ў шосты раз. За час існавання, а гэта чвэрць стагоддзя, сход стаў не проста адметнай з'явай грамадскага жыцця краіны, а ператварыўся ў неад'емную частку нацыянальнай палітычнай культуры, сфарміраваўся як адзін з элементаў беларускай палітычнай традыцыі, — лічыць **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Валянцін СЕМЯНЯКА.** — Кожны раз яго правядзенне і звязаныя з гэтым грамадскія працэсы не толькі выклікаюць усеагульны інтарэс, становяцца прадметам для нацыянальнай дыскусіі, але і вызначаюць тэндэнцыі развіцця грамадства на найбліжэйшую перспектыву. У гэтым заключаецца значэнне ўсенароднага форуму для фарміравання дзяржаўнай палітыкі і ўнікальнасць гэтай формы дэмакратыі як аднаго з інструментаў народаўладдзя.

Парламентарый вызначае некалькі адметнасцяў VI Усебеларускага народнага сходу.

Першая — форум праводзіцца ў перыяд дастаткова вострага палітычнага супрацьстаяння легітымнай дзяржаўнай улады спробам гвалтоўнага насаджэння метадаў «каляровых рэвалюцый» на беларускай зямлі, лічыць Валянцін Семяняка і дадае, што гэтыя метады не спрацавалі.

Другая адметнасць — краіна стаіць перад складанай праблемай перафарматавання адносін паміж рознымі палітычнымі плынямі, перазагрузкі механізмаў, а можа, і асобных прынцыпаў узаемадзеяння дзяржаўных органаў кіравання, палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў, дадае дэпутат.

Старшыня профільнай парламенцкай камісіі падкрэслівае, што дзяржаўнае будаўніцтва вызначаецца вялікай ступенню інертнасці — яго наступствы праяўляюцца не імгненна, а праз працяглы прамежак часу, таму працэс гэты патрабуе асаблівай адказнасці.

— Акрамя таго, пэўная інертнасць дзяржаўных пераўтварэнняў не прадугледжвае імгненнага перафарміравання грамадскіх адносін, — дадае Валянцін Семяняка. — Галоўнае расчараванне ўсіх рэвалюцыянераў, як правіла, хаваецца ў чаканні імклівага выніку — «вось зменім уладу і зажывём...» У рэальнасці ўсё адбываецца з дакладнасцю да наадварот: імкліва разбураюцца не толькі палітычныя інстытуты, але і эканамічныя мадэлі, што імгненна адбіваецца на дабрабыце людзей».

Эвалюцыйны падыход, якім кіруецца беларуская ўлада, калі прапануе правядзенне Усебеларускага народнага сходу, — адзіна правільны і рэальны інструмент да праектавання механізмаў згуртавання грамадства і пошуку фарматаў запатрабаваных часам перамен, лічыць дэпутат.

Яшчэ адна адметнасць сёлетняга народнага форуму — абмеркаванне вынікаў агульнанацыянальнай дыскусіі. «Менавіта цывілізаваная дыскусія, дыялог у пошуку шляхоў развіцця грамадства — асноўны інструмент падрыхтоўчай работы да правядзення сходу. І ў гэтым, на мой погляд, найвялікшая каштоўнасць аналітычных матэрыялаў, прадстаўленых у аргкамітэт сходу», — лічыць парламентарый і дадае, што Пастаянная камісія, якую ён узначальвае, знаходзілася ў цэнтры гэтай работы.

Пры ўсёй стракатасці думак ён вызначыў некалькі найбольш характэрных тэндэнцый, якія праявіліся ў час дыскусій.

— У прыватнасці, нашы грамадзяне ў большасці выступаюць за захаванне асноўных прынцыпаў дзяржаўнага будаўніцтва: сацыяльную накіраванасць дзяржаўнай эканамічнай палітыкі, незалежнасць краіны, прыхільнасць да традыцыйных культурных і маральных каштоўнасцяў. Вялікая частка дасланых прапаноў утрымлівае словы падтрымкі дзеючаму Прэзідэнту краіны Аляксандру Лукашэнку, яго палітычнаму курсу і дзяржаўнай палітыцы, — расказаў парламентарый.

У той жа час парламентарый сутыкнуўся са спробамі спыніць дыялог, сарваць яго ход, што, па меркаванні дэпутата, сведчыць пра негатоўнасць асобных прадстаўнікоў беларускага грамадства да цывілізаванай дыскусіі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
**Фота БелТА.**

# «Выхоўваць патрыётаў трэба на мясцовым матэрыяле»



— Усебеларускі народны сход, безумоўна, стане ў пэўным сэнсе калектыўным мазгавым штурмам наспелых вострых праблем і спробай знайсці аргументаваныя адказы на злабадзённыя пытанні, якія сёння ва ўсіх на слыху, — лічыць **Людміла МАЦЮШКОВА, старшыня Першамайскай раённай арганізацыі г. Мінска РГА «Белая Русь».** — Да сур'ёзнай і плённай размовы на сходзе рыхтуюцца і дэлегаты ад Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь». Як старшыня яе арганізацыі Першамайскага раёна Мінска магу запэўніць, што ўвогуле прадстаўнікі сталіцы ад «Белай Русі» возьмуць самы актыўны ўдзел у абмеркаванні парадку дня сходу.

Як вядома, на разгляд удзельнікаў будуць вынесены асноўныя палажэнні Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2021—2025 гады і напрамкі грамадска-палітычнага развіцця краіны. На мой погляд, сярод мноства, безумоўна, важных пытанняў трэба абавязкова абмеркаваць захаванне гістарычнай памяці сярод жыхароў Беларусі. Ведаю, тэма ўжо не новая, але, тым не менш, яе далейшая глыбокая распрацоўка, удалае прыстасаванне да сённяшніх складаных абставінаў уяўляе адну з самых актуальных ідэалагічных задач.

Скажам, у справе выхавання падрастаючага пакалення. У гэтым сэнсе зараз самы час актывізаваць работу па ваенна-патрыятычным выхаванні юнакоў і дзяўчат на мясцовым матэрыяле, які выдатна паказвае вытокі, ролю і значэнне подзвігу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Беларуская зямля багатая на такія прыклады, якія проста неабходна выкарыстоўваць у выхаваўчых мэтах.

Спашлюся на ўласны досвед. Я працяглы тэрмін працавала дырэктарам мінскай сярэдняй школы № 45, у якой больш чым 15 гадоў назад быў адкрыты музей гісторыі школы. У музеі таксама даволі шырока прадстаўлена і экспазіцыя, прысвечаная гісторыі газеты «Звязда». Наведвальнікі музея могуць даведацца пра яскравае геройчнае мінулае выдання, газеты-падпольшчыцы, газеты-партызанкі. Чаму нас, педагогаў, зацікавіла гісторыя «Звязды»?

Адказ даволі просты. У свой час наша школа пераехала ў новы будынак па вуліцы Нікіфарава, 18. Нагадаю, Вячаслаў Кандрацьевіч Нікіфараў — актыўны ўдзельнік мінскага падполля, адзін з тых, хто выпускаў у захопленым Мінску падпольную «Звязду». Восенню 1942-га яго арыштавалі. Загінуў Нікіфараў у канцы 1942 ці пачатку 1943 года ў лагеры смерці Трасцянец.

Вось у нашых настаўнікаў і ўзнікла ідэя стварыць у школьным музеі экспазіцыю газеты «Звязда» і тым самым расказваць яго юным наведвальнікам пра подзвіг Вячаслава Кандрацьевіча Нікіфарава і яго паплечнікаў, пра іх унёсак у Вялікую Перамогу. На базе музея вырашылі праводзіць мерапрыемствы, прысвечаныя, у тым ліку, захаванню гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне на тэрыторыі часова акупаванай Беларусі, усенароднай барацьбе з бязлітасным ворагам.

Карацей, слаўная баявая гісторыя «Звязды» дапамагае настаўнікам весці актыўную работу па ідэйна-патрыятычным выхаванні школьнікаў. І ўвогуле лічу, што прывіваць патрыятызм нашай маладой змене варта з юнацтва, літаральна з першых класаў навучання.

Таксама хочацца падкрэсліць будучую значнасць абмеркавання ў маладзёжным асяроддзі рашэнняў Усебеларускага народнага сходу. А пакуль напярэдадні сходу дэлегатам трэба часцей сустракацца з юнакамі і дзяўчатамі ў навучальных установах, у тым ліку і ў школах, весці адкрыты дыялог, шчыра адказваць на вострыя пытанні маладых. І такая работа — галоўнае ў дзейнасці дэлегатаў на бягучы момант.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**
**Фота belayarus.by**

# «Не хапае дакладнага, празрыстага механізма ўзаемадзеяння»

Летась **Аляксей ЗАЙЦАЎ, старшы выкладчык кафедры агульнай фізікі Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф. Скарыны, пераможца 9-га сезона Рэспубліканскага конкурсу «100 ідэй для Беларусі»,** скончыў аспірантуру і атрымаў дыплом даследчыка. Ён — педагог дадатковай адукацыі вышэйшай катэгорыі. Для заняткаў са школьнікамі стварыў гуртох робататэхнікі. Пяць гадоў запар прымаў удзел у рэспубліканскім конкурсе «100 ідэй для Беларусі» — прэзентаваў праекты па энергазберажэнні, экалогіі і медыцыне. У рэспубліканскім фінале 8-га сезона конкурсу інавацый прадставіў свой «Хутар Мебіуса». Гэта праект па стварэнні аўтаномнай станцыі для ўкаранення на фермерскіх і сельскагаспадарчых участках. Яе сутнасць — назапашаная энергія сонца і ветру выкарыстоўваецца для паліву, збору метэаралагічных даных, кантролю за станам сельгаскультур і іх абароны ад шкоднікаў. Пасля гэта работа даследчыка была ацэнена сярэбраным медалём у фінале V Міжнароднага конкурсу «Інтэрнэт +» па інавацыях і прадпрымальніцтве сярод студэнтаў і выпускнікоў ВНУ, якія праходзіў у Хенджоу (КНР).



Аляксей Зайцаў — фіналіст стартап-тура фонду «Сколкава» ў Мінску, актыўны ўдзельнік рэспубліканскага праекта «Разам» і пераможца 9-га сезона Рэспубліканскага конкурсу «100 ідэй для Беларусі». Ён — стваральнік уласнай лабараторыі інавацыйных праектаў. Удзельнік Усебеларускага народнага сходу ад Гомельшчыны лічыць вельмі важным, што на форуме ёсць магчымасць данесці сваю грамадзянскую пазіцыю.

— Наша моладзь сёння інтэгруецца ў такі перспектыўны кірунак, як інавацыйнае развіццё краіны. Упэўнены, што галоўным у такой дзейнасці не павінен быць пасыл «ідэя дзеля ідэі, якую можна «найлепш прадаць», выйграць фінансава. І сілы на складаным шляху і поспех прыходзяць ад імкнення рэалізаваць талент на карысць свайго народа, сваёй краіны, зрабіць асабісты ўнёсак у навукова-тэхналагічны патэнцыял роднай Беларусі, — адзначыў Аляксей Зайцаў.

Як прадстаўнік моладзі, гамяльчанін на Усебеларускім народным сходзе хацеў бы ўзняць пытанне інфармацыйнай падтрымкі і каардынацыйнай работы з творчай моладдзю, якая мае свае распрацоўкі.

— Як удзельнік шэрагу конкурсаў інавацыйных праектаў адзначу, што часам у такой рабоце бракуе імкнення да канчатковай рэалізацыі «прадукту», не хапае дакладнага празрыстага механізма ўзаемадзеяння творчай моладзі з адміністрацыямі раёнаў, дзе жывуць і «крэатывяць» гэтыя маладыя людзі. Важна, каб пасля конкурсаў, дзе вызначаюцца найлепшыя ідэі працягвалася курыраванне праектаў кампетэнтнымі спецыялістамі, вялася пастаянная работа па прасоўванні перспектыўных інавацый, — лічыць Аляксей Зайцаў.

Малады гомельскі навуковец выступае за стварэнне дзяржаўнай структуры — адмысловага банка інавацый. Гэта дазволіць не дапусціць «уцечкі мазгоў», падтрымаць маладых наватараў, якім на пачатку дзейнасці не хапае ведаў і навыкаў, як прасоўваць свой праект, прыцягнуць інвестара да яго рэалізацыі, часта не хапае нязначнай фінансавай дапамогі.

— Лічу, што вельмі падтрымае маладых творцаў праходжанне стажыроўкі альбо практыкі па павышэнні свайго патэнцыялу. Зразумела, не ўсе могуць адразу стаць бізнес-аналітыкамі, узяць і самастойна з нуля выцягнуць праект. У нас шмат маладых людзей, якія ў тэхнічным плане развітыя, але слабыя ў плане менавіта рэалізацыі сваёй ідэі. Здараецца, апускаюць рукі, губляюцца, пасля конкурсаў распрацовак з імі не заўсёды нават падтрымліваецца сувязь. Калі такую работу рэгуляваць на дзяржаўным узроўні, гэта будзе стымуляваць цікавасць студэнтаў ВНУ да інавацый і прадпрымальніцтва, а наша краіна захавае для свайго навукова-тэхналагічны патэнцыялу найлепшыя ідэі, — упэўнены дэлегат VI Усебеларускага народнага сходу Аляксей Зайцаў.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**Фота з архіва героя.**

На слыху

# Тры катэгорыі адміністрацыйных правапарушэнняў

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў новыя Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях. Раней яны абмяркоўваліся і былі падтрыманы дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў і Саветам Рэспублікі.**

Новыя кодэксы накіраваны на лібералізацыю адміністрацыйнай адказнасці і адначасова з тым на спрашчэнне парадку прыцягнення да яе юрыдычных і фізічных асоб. Але асноўнай навелай перш за ўсё з'яўляецца іх скіраванасць на прафілактыку і папярэджанне. Змены ў заканадаўства былі падрыхтаваны па даручэнні кіраўніка дзяржавы.

Сярод іншага была ўведзена катэгарызацыя правапарушэнняў. Яны падзелены на тры асноўныя групы: адміністрацыйныя правіннасці, а таксама значныя і грубыя адміністрацыйныя правапарушэнні.

— Гэта было неабходна для таго, каб дыферэнцыраваць адказнасць грамадзян, — паведаміў **першы намеснік начальніка Акадэміі МУС Аляксей БАШАН**. — Падчас аналітычнай працы мы ўбачылі, што ў краі-



не дастаткова вялікая колькасць грамадзян прыцягваецца да адміністрацыйнай адказнасці. І трэба было разабрацца: ці настолькі ў нас грамадства само па сабе неправапаслухмянае або ў нас ёсць якія-небудзь аб'ектыўныя падставы для таго, каб змяніць заканадаўства?

Быў прааналізаваны значны масіў правапарушэнняў, якія выяўляюся штогод. Спецыфіка гэтай работы была ў тым, што больш за 90 працэнтаў пратаколаў складаецца менавіта супрацоўнікамі органаў унутраных спраў.

— І мы прыйшлі да высновы, што насамрэч ёсць шэраг правапарушэнняў, якія можна вывесці ў разрад правіннасцяў і значных правапарушэнняў для таго, каб знізіць колькасць фактаў прыцягнення грамадзян да адміністрацыйнай адказнасці. А з іншага боку, будзе ўзмоцнены прафілактычны складнік. І наколькі зараз бачыцца, гэта задача была выканана эфектыўна і дастаткова добра, — лічыць Аляксей Башан.

Ён таксама распавёў пра выпадкі, калі чалавек можа быць наогул вызвалены ад адміністрацыйнай адказнасці:

— Новы Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях утрымлівае спецыяльныя прадпісанні. Напрыклад, калі чалавек упершыню здзейсніў нейкую правіннасць, але раней да адказнасці не прыцягваўся, то ніякага пакарання для яго не будзе, акрамя вынясення папярэджання. Мы не ставім задачу пакараць абсалютна ўсіх, а хочам дамагчыся правапаслухмяных паводзін. Пры гэтым мы не можам згубіць рэгулюючую правааховую функцыю кодэксаў. Трэба жорстка спыняць грубыя правапарушэнні, якія рэальна ствараюць небяспеку для тых, хто навокал. Менавіта таму павялічана адказнасць за некаторыя правапарушэнні. Напрыклад, калі на працягу года чалавек здзяйсняе адно і тое ж грубае правапарушэнне, то тэрмін адміністрацыйнага арышту павялічваецца з 15 да 30 сутак.

Аляксей Башан асобна спыніўся на навелах Працэсуальна-выканаўчага кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях:

— На парадку дня стаяла пытанне аб укараненні новых форм і метадаў у адміністрацыйным працэсе. Для нас важна было максімальна спрасціць вядзенне працэсу, калі гэта магчыма. Гаворка тут ідзе пра наяўнасць відэа- і аўдыязапісаў. Які сэнс у шматгадзінных разбіральніцтвах, калі правапарушальнік згодны сам з тым, што ён здзейсніў учынак, за які прадугледжана адказнасць? Усё гэта ў сукупнасці павінна спрасціць працэс прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці і разам з тым вызвалення ад яе. Але пры гэтым кропкава і дастаткова жорстка рэагаваць на здзяйсненне грубых правапарушэнняў.

Па словах Аляксея Башана, таксама ў арсенале праваахоўнікаў з'явіліся меры прафілактычнага ўздзеяння ў дачыненні да непаўналетніх.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Надвор'е

# НА ВЫХАДНЫЯ НАС ЗУСІМ ЗАМАРОЗІЦЬ?

## У ноч на нядзелю чакаецца да мінус 25, месцамі — 26—29 марозу

**Адна на адну зімы ў нас непадобныя. Калі летась зімы практычна не было (згодна з нацыянальнай нормай тэмпературы ў халодны перыяд, кліматычная зіма на тэрыторыі нашай краіны ў сезон 2019—2020 не надышла; ва ўсе зімовыя месяцы так і не адбыўся пераход сярэдняй тэмпературы праз нуль у бок паніжэння». — Аўт.), то ў гэты сезон зіма, відаць, «стрэліць» анамальным холадам непасрэдна ў студзені.**
**Маразы амаль да 30 градусаў ніжэй за нуль чакаюцца ў нашай краіне ўжо да канца гэтага тыдня, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Тэмпература паветра пачала паступова паніжацца ўжо ўчора, але асноўнае пахаладанне яшчэ наперадзе. У пятніцу, у суботу і потым у нядзелю чакаецца ўзмацненне марозаў.

Сёння ўдзень, якраз на сярэдзіну зімы, месцамі пройдзе невялікі снег. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе 13—19 градусаў марозу, месцамі — мінус 20—22 градусы, у паўднёва-заходніх раёнах — ад мінус 9 да мінус 12 градусаў.

Паўночны вецер прыляціць да нас і ў суботу. У гэты дзень месцамі па краіне пройдзе невялікі кароткачасовы снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 16 да 23 марозу, пры праясненнях — да мінус 25 градусаў. Удзень будзе 13—20 ніжэй за нуль, месцамі — да мінус 22 градусаў, па Брэсцкай вобласці — мінус 10—12 градусаў.

Уначы і раніцай на наступны дзень, у нядзелю, у асобных раёнах краіны пройдзе невялікі снег, удзень пераважна без ападкаў. На дарогах месцамі чакаецца галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўночны, паўночна-заходні ўмераны, «куслівы». Тэмпература паветра ўначы складзе 18—25 марозу, пры праясненнях — ад мінус 26 да мінус 29 градусаў. Удзень будзе таксама досыць халодна — 14—19 марозу.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня захаваецца маласнежнае марознае надвор'е.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Здарэнні

# ПАКІНУЛІ ДЗЯДУЛЮ БЕЗ ЗБЕРАЖЭННЯЎ

**У міліцыю звярнуўся пажылы мінчанін, які паведаміў, што з яго кватэры знікла буйная сума грошай.**

У ходзе аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў супрацоўнікамі крымінальнага вышуку Ленінскага РУУС сталцы было ўстаноўлена, што да крадзяжу датычныя двое мужчын 46-ці і 44-х гадоў, паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама.

Са слоў затрыманых, яны зайшлі да суседа, каб пазычыць грошай для набыцця спіртнога. Паколькі ў пацярпелага меліся праблемы са здароўем, ён папрасіў 46-гадовага мінчаніна падаць яму пакет з грашыма. Як аказалася, усе свае зберажэнні дзядуля захоўваў у пакоі пад дыванам. Адзін са знойдзеных канвертаў з 3000 долараў і 2000 еўра падазраваны паклаў у кішэню, а другі канверт перадаў дзядулю, каб той пазычыў на выпіўку.

Вядома, што ўкрадзеныя грашовыя сродкі мужчыны падзялілі паміж сабой. 44-гадовы змоўшчык паспеў выдаткаваць грошы на пагашэнне даўгоў, набыццё прадуктаў харчавання і адзення. У другога грашовыя сродкі канфіскаваныя ў поўным аб'ёме пры затрыманні.

Раней падазраваныя ўжо прыцягваліся да крымінальнай адказнасці за маёмасныя злачынствы.

# «Паклаў вока» на кабель

**Заява аб крадзяжы маёмасці паступіла ад 33-гадовага мінчаніна. Мужчына растлумачыў міліцыянерам, што з яго аўтамабіля знік кабель, патрэбны яму для работы.**

У ходзе правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў аператыўнікамі крымінальнага вышуку Партызанскага РУУС сталіцы было ўстаноўлена, што 39-гадовы непрацуючы мясцовы жыхар, праходзячы каля прыпаркаванай машыны, заўважыў унутры яе правады. Тузаючы за ручку аўтамабіля, мужчына выламаў дзверы, хутка дастаў з салона кабель і збег.

У самыя кароткія тэрміны мінчаніна затрымалі і канфіскавалі частку ўкрадзенай маёмасці. Па словах мужчыны, астатні кабель ён збыў, а атрыманыя грошы выдаткаваў на асабістыя патрэбы, паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама.

Матэрыяльная шкода, прычыненая заяўніку, склала каля 5600 рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Кеніі выявілі яшчэ 16 разнавіднасцяў каранавіруса



Навукоўцы з медыцынскага даследчага інстытута Кеніі выявілі ў краіне 16 новых разнавіднасцяў каранавіруса, паведаміла мясцовая газета Nation. Яны цалкам адрозніваюцца ад штамаў, выяўленых у Вялікабрытаніі і ў Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы. Навукоўцы зафіксавалі іх распаўсюджванне ў васьмі акругах паміж чэрвенем і кастрычнікам мінулага года. Усяго ў краіне распаўсюджваецца 20 разнавіднасцяў каранавіруса, прычым чатыры былі выяўлены яшчэ летась у сакавіку. Па словах доктара Чарльза Агоці з медыцынскага інстытута, большасць мутацый нязначная і не адыграе асаблівай ролі. Але адзін штам унікальны.

## Telegram заняў другое месца па колькасці запамповак у ЗША



Месенджар Telegram стаў другім дадаткам у ЗША па колькасці запамповак пасля таго, як былі заблакіраваны акаўнты прэзідэнта ЗША Дональда Трампа ў Twitter і Facebook. Аб гэтым паведаміла газета The Telegraph. Таксама росту папулярнасці спрыяла выдаленне з платформаў Apple і Google сацсеткі Parler, у якую перайшлі прыхільнікі Трампа. У перыяд з 6 да 10 студзеня карыстальнікі ЗША ўстанавілі Telegram каля 545 тысяч разоў, што ўтрая перавысіла паказчыкі папярэдняга тыдня, паведаміла кампанія Sensor Tower. Выданне The Telegraph адзначыла, што папулярнасць Telegram вырасла на навінах вакол новай палітыкі прыватнасці месенджара-канкурэнта WhatsApp.

## У Інданезіі знайшлі найстаражытнейшы наскальны малюнак



Ён выяўлены ў пячоры на поўдні вострава Сулавесі, паведаміў канал CNN. Археолагі знайшлі малюнак барадаўчатай свінні. Яму як мінімум 45,5 тысячы гадоў. Выява нанесена чырвонай охрай. Як адзначае навуковы часопіс Science Advances, дэталі паказваюць на тое, што першапачаткова былі намаляваныя тры свінні і яшчэ адна жывёліна, якую немагчыма вызначыць з упэўненасцю. Як перадае CNN, спецыялісты спадзяюцца знайсці ва Усходняй Інданезіі іншыя ўзоры наскальнага жывапісу, якія могуць адносіцца да часу, калі Homo sapiens трапілі ў Паўднёва-Усходнюю Азію 60—70 тысяч гадоў таму. Знаходка ставіць пад сумненне здагадку аб тым, што гісторыя мастацкага самавыяўлення чалавека пачалася з Еўропы.

Духоўныя каштоўнасці

# ХРАМ, ЯКІ АБ'ЯДНОЎВАЕ ЛЮДЗЕЙ

**Сімвалічна, што ў Год народнага адзінства, які абвясціў кіраўнік нашай дзяржавы — Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА, адным са знакавых кніжных падарункаў становіцца выданне «Беларускай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі» — «Храм-помнік зямлі Беларускай».**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Пад адной вокладкай сышліся фотаальбом і манаграфічнае даследаванне-храналогія гісторыі будаўніцтва Храма-помніка ў гонар Усіх Святых і ў памяць аб ахвярах, якія выратаванню нашай Айчыны паслужылі. Ужо на самым пачатку кнігі мы чытаем: «...Ён узводзіўся сумеснымі намаганнямі беларускага народа, дзяржавы і Праваслаўнай Царквы». Выключна арганізаваны, выключна дзеяздольны генератар гэтай вялікай, разлічанай на стагоддзі справы, настаяцель Усіхсвяцкага прыхода протаіерэй Фёдар Поўны. Ён асабіста і аўтар ідэі, куратар выдавецкага праекта.

Як уражвае сучасная гісторыя храма, гісторыя яго будаўніцтва, самой ідэі стварэння такога жыццядайнага помніка, так уражвае і розгалас, грамадская роля гэтай сапраўднай святыні. Такая кніга як выразны ілюстратар, як адметная, яркая хроніка будаўніцтва, дзейнасці храма, так і яго надзвычайнага судакранання з жыццём праваслаўнай царквы ўвогуле, павінна была з'явіцца даўно. Але, можа быць, і добра, што на свет яна з'явілася ў самы пярэдадзень Года народнага адзінства...

Гартаеш старонкі выдання, і неўпрыкмет складваецца ўражанне, што сустракаешся са знакамітымі асобамі, прыслухоўваешся да выкладзеных імі думак, зазіраеш у падтэкст прамоўленага. Вось і словы Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла (ён сказаў іх у храме 14 кастрычніка 2018 года) не могуць не ўражваць: «Сёння з асаблівым пачуццём пераступіў парог гэтага храма. Быў тут яшчэ падчас будаўніцтва, і тады цяжка было ўявіць тое хараство, якое цяпер адкрываецца нашаму погляду. Гэта сапраўды годны мемарыяльны храм, прысвечаны ўсім святым і памяці ўсіх загінулых абаронцаў нашай Айчыны, абаронцаў беларускай зямлі. Мы ведаем, наколькі суровай была вайна тут, у Беларусі, якой патрабавала мужнасці супраціўленне мірных грамадзян нашэсцю іншаземцаў. Мы ведаем, якую вялікую ролю партызанская барацьба ў Беларусі сыграла ў набліжэнні агульнай перамогі над страшэнным ворагам. І як жа шмат людзей тут загінула: і ў партызанскіх атрадах, і ў засценках ворага, і падчас магутных наступальных і абарончых аперацый Савецкай Арміі. Храм гэты будзе месцам малітвы аб правадырах і воінах, на полі бітвы за Айчыну нашу загінулых, за тых нашых родных і блізкіх, якія былі забіты ці без вестак прапалі на беларускай зямлі». І яшчэ — ужо зусім асабістае ад Патрыярха Кірыла: «Мой родны дзядзька Уладзімір па матчынай лініі, у гонар якога мяне назвала маці пры хрышчэнні, загінуў у першыя дні вайны на беларускай зямлі ля сцен Брэсцкай крэпасці. Думаю, што ў вельмі многіх людзей, якія пражываюць не толькі ў Беларусі, але і ў іншых землях нашай неабсяжнай гістарычнай радзімы, ёсць блізкія, хто загінуў тут. І таму, молячыся аб ахвярах, якія народ наш нёс у гэтую страшную вайну на беларускай зямлі, вы адначасова будзеце маліцца і з тымі, хто нарадзіўся не толькі ў Беларусі, але для якіх Беларусь стала месцам, дзе для іх вырашаўся лёс Айчыны...» Сапраўды, «Дай Бог, каб гэты храм аб'ядноўваў людзей, у першую чаргу тых, хто страціў сваіх родных і блізкіх на палях бітваў, але храм не павінен быць толькі мемарыяльным месцам. Гэта павінна быць месца духоўнага жыцця хрысціян...»


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Аддрукавана кніга «Храм-помнік зямлі Беларускай» на Паліграфічным камбінаце імя Якуба Коласа. Наклад — 3000 экзэмпляраў. Несумненна, выданне заўважаць не толькі ў Беларусі, але і ва ўсім праваслаўным свеце.

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

# Жывой сувязі чытачоў і «Сельской газеты» — 100 гадоў

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Сяргей Рыгоравіч, які ён, ваш юбілейны нумар?***

— Вядома ж, асаблівы. Ён выйшаў сёння, як і належыць, у святочным убранні. Мы спрабуем здзівіць, падводзім прамежкавыя вынікі. Усё, што зрабілі на нашых старонках да такой даты і будзем рабіць пасля, арыентавана ў першую чаргу на нашых чытачоў. Мы хочам, каб яны нас паважалі, любілі, выбіралі. Таму абапіраемся на іх густ, інтарэсы. Прыемна тое, што ёсць унікальныя адрасы на карце Беларусі, дзе нас вельмі шануюць, актыўна выпісваюць, таму будзе фотарэпартаж пра гэтых чытачоў. А таксама пра цікавых герояў, знаёмых нам здаўна, за якімі назіралі на працягу некаторага часу, і да юбілею пагутарылі, каб даведацца, што змянілася ў іх жыцці. Не абыдзецца і без шматлікіх віншаванняў. У тым, што ўжо 100 гадоў нас выбіраюць, паважаюць чытачы, заслуга ўсіх пакаленняў журналістаў газеты, пачынаючы з першага яе галоўнага рэдактара Сцяпана Герасімавіча Булата. «Аром і пішам разам» — слоган, які вельмі выразна адлюстроўвае нашы задачы і традыцыі. Пакуль чытачы аруць, мы пішам пра гэта. Іншым часам можам і памяняцца месцамі.

Дарэчы, сёння з нагоды юбілею ў нас пройдзе фотавыстаўка «Зямля і людзі: стужка часу», урачыстая прэзентацыя якой адбудзецца ў Вучэбна-выставачным павільёне Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта, зразумела, ва ўмовах эпідэміялагічнай бяспекі для яе наведвальнікаў. Будуць прадстаўлены найлепшыя работы нашых журналістаў з фонду Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў, якія раскажуць пра людзей беларускай вёскі, гісторыю развіцця нашага аграпрамысловага комплексу. Таксама плануем узнагароджанне ўсіх тых, хто мае дачыненне да развіцця выдання, вядома ж, знойдзем магчымасць павіншаваць і нашых ветэранаў працы, падзякаваць за тое, што яны ў свой час зрабілі для «Сельской газеты».

***— Вашы чытачы актыўна дасылалі і дасылаюць да 100-годняга юбілею не толькі віншаванні, але і свае творчыя работы...***



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

— Так, самыя крэатыўныя аўтары ўжо ўзнагароджаны каштоўнымі падарункамі. Заўсёды калегі актыўна ўзаемадзейнічаюць з падпісчыкамі, гэта вельмі важна. Атрымліваем зваротную сувязь не толькі ў выглядзе лістоў. Імкнёмся праводзіць розныя творчыя спаборніцтвы, конкурсы, гэта і ёсць жывая сувязь з аўдыторыяй. Штогод ініцыіруем нешта цікавае.

***— У вас ёсць электронны музей, які вы стварылі яшчэ да 90-годдзя выдання. Наколькі ён карыстаецца папулярнасцю?***

— Калісьці ў «Сельской газете» быў музей у ранейшым уяўленні: з каштоўнымі рэчамі, фотаздымкамі і іншым. Там тады працавала наш архіварыус Леніна Мацвееўна Шуман, яна збірала ўсе рарытэты, узнагароды і іншыя фрагменты гісторыі выдання. Калі мы пераехалі на новае месца, у новае памяшканне, яно не дазволіла размясціць усё гэта тут, і музей неяк сышоў на другі план. Таму мы перанеслі ўсю гісторыю з 1921 года па 2011 год на лічбавыя носьбіты. Зараз, дагэтуль стагоддзя, дапоўнілі яго, дапрацавалі, і любы ахвотны можа зайсці на сайт «Сельской газеты», які знаходзіцца на аб'яднаным партале «СБ. Беларусь сегодня», і паглядзець, прачытаць для сябе нешта патрэбнае і цікавае.

***— На старонках вашай газеты вы расказваеце пра жыццё людзей у сельскай мясцовасці. Але выданне рэспубліканскае, і таму яно ў тым ліку асвятляе сусветныя падзеі. Як захоўваеце баланс паміж рознымі тэмамі?***

— Я заўсёды кажу на планёрцы журналістам: нам цікава ўсё — ад эканомікі краіны да сусветных навін. Але пры гэтым мы не жоўтая прэса, у нас іншыя мэты і задачы. Ва ўсе часы мы былі салідным дзяржаўным выданнем. Гэтай лініі прытрымліваемся і цяпер, бо я як галоўны рэдактар у сілу сваіх перакананняў, грамадзянскай пазіцыі, а таксама перакананняў сваіх журналістаў па палітычнай, грамадзянскай пазіцыі дакладна ведаю, што можа знаходзіцца ў нашай газеце, а чаго быць не павінна.

Вядома ж, падтрымліваем і даследуем тое, што робяць спецыялісты ў сферы аграпрамысловага комплексу, актыўна ўзаемадзейнічаем з органамі ўлады, дапамагаем у вырашэнні розных праблем. Актыўна працуем над тым, як на месцах выконваюцца важныя даручэнні Прэзідэнта краіны ў гэтай галіне, як увасабляюцца ў жыццё ўрадавыя пастановы, рашэнні Мінсельгасхарча.

Можам і пакрытыкаваць іх работу, але не ачарняем, не разводзім фэйкі, — усё бяром на «аловак», едзем на месца, дзе, на думку кагосьці, ёсць пэўная праблема, і глядзім, ці так гэта на самай справе, а пасля публікуем сваё расследаванне. Гэта важна — данесці да нашых чытачоў праўду. Заўсёды рады, калі ёсць пазітыўная, канструктыўная крытыка і адпаведнае рэагаванне.

Сяргей Рыгоравіч адзначае, што вельмі важна прапанаваць свайму чытачу самадастатковую газету.

— Мы ж пішам не толькі пра вяскоўцаў на іх працоўных месцах, пра фермы, надоі, мінеральныя ўгнаенні... Напрыклад, знаёмім чытачоў з тэатрам, віртуальна водзім іх у Оперны, Купалаўскі, публікуючы ў сваіх нумарах рэпартажы і мяркуючы, што кагосьці гэта падштурхне да таго, каб паехаць і паглядзець нейкую пастаноўку. А чытачы пішуць лісты, тэлефануюць, утвараючы такім чынам зваротную сувязь. Мы да гэтага прыслухоўваемся: калі не будзем пісаць пра тое, чаго хочуць, дык хто з намі застанецца? Часам дыскутуем з чытачамі і таксама з рознымі спецыялістамі, з якімі працуем. Гэта добра — у спрэчцы нараджаецца ісціна. Нават калі ідзе хваля нязгоды — мне гэта падабаецца, бо мы ж не ворагі адно аднаму, шукаем найлепшы варыянт для вырашэння пастаўленых мэт. Асаблівасць друкаванай прэсы ў тым, што з-за сваёй перыядычнасці (чытачы атрымліваюць «Сельскую газету» тры разы на тыдзень) мы не такія аператыўныя, як інтэрнэт-СМІ і сацсеткі. Таму робім акцэнт на аналітычныя матэрыялы, а калі ёсць навіна — заходзім «за кулісы»: распавядаем, што за ёй стаіць, шукаем падрабязнасці, пашыраем інфармацыю, распавядаем пра наступствы, — у гэтым і ёсць прызначэнне газеты, якая хоча, каб ёй давяралі, якая прэтэндуе на аўтарытэтнасць.

Дарэчы, і сёлета нашу газету чакаюць прыемныя змяненні: палепшыцца дызайн выдання, пачнуцца новыя праекты, бо да нас прыходзяць новыя падпісчыкі, якія хочуць убачыць абноўленае выданне. Увогуле, усе нашы праекты і рубрыкі важныя для нас і нашых чытачоў. Напрыклад, ёсць унікальны «Аддзел добрых спраў», калі выбіраем нашага чытача, героя з сельскай мясцовасці, які даўно пра нешта марыць. Скажам, наведаць Белавежскую пушчу або Мінскі трактарны завод. Мы дапамагаем з выкананнем гэтага жадання.

***— Якімі ўзнагародамі, заслугамі газеты вы як галоўны рэдактар ганарыцеся?***

— Іх у выдання вельмі шмат. Ганаруся ўсімі, што ўвайшлі ў гісторыю «Сельской газеты». Слаўнымі традыцыямі пакаленняў журналістаў, пачынаючы з 1921 года. Сёння мы гэтыя традыцыі прымнажаем, працуем на адной хвалі са сваімі чытачамі. Таму нам лёгка выбіраць тэмы, напрамкі, структуру выдання. Наш калектыў — сапраўдныя прафесіяналы. Журналістаў не вельмі шмат, але кожны — на вагу золата. Як правіла, з сельскай мясцовасці, і гэта добра. Бо журналісты павінны адчуваць сябе камфортна ў камандзіроўках, у якіх яны знаходзяцца пастаянна. Без іх добрага матэрыялу не зробіш — трэба і ў поле выехаць, і з мясцовымі жыхарамі пагутарыць.

***— А які быў ваш асабісты шлях станаўлення ў прафесіі?***

— Я сам з вёскі і вельмі ганаруся гэтым. Мне здаецца, я добра разумею вяскоўцаў, і вельмі арганічна, што я стаў менавіта журналістам-аграрыем. Мой бацька працаваў доўгі час старшынёй калгаса, мама — дырэктарам Дома культуры, загадчыцай клуба, хоць па адукацыі яна аграном. У «Сельской газете» я пачаў працаваць адразу пасля факультэта журналістыкі БДУ 21-гадовым юнаком. Вядома, прафесійнага вопыту тады ніякага не было. Быў замацаваны за аддзелам культуры карэспандэнтам, больш вопытныя калегі дапамагалі мне, многае тлумачылі. З таго часу я стаў старанна і ўзважана думаць над словамі, загалоўкамі, вобразамі, стаў выпрацоўваць свой стыль, лепш працаваць над структурай рэпартажаў, мовай, каб не было шаблонных слоў, фраз. Дзякуючы чаму, магчыма, і стаў галоўным рэдактарам газеты, якую бясконца люблю і ёй адданы. Зараз свой прыклад прыводжу і маладым спецыялістам, якія прыходзяць да нас пасля факультэта журналістыкі. Сёння ў газеце працуюць у асноўным, праўда, дзяўчаты, але вельмі таленавітыя, якія супрацоўнічаюць з намі з другога-трэцяга курса.

***— Што пажадаеце з нагоды 100-гадовага юбілею калектыву, сваім чытачам?***

— Каб вяскоўцы жылі яшчэ лепш і каб мы па-ранейшаму шанавалі іх працу! Каб газета заставалася цікавай сваім падпісчыкам, а калектыў і надалей разумеў і рабіў усё і крышку больш, каб быць запатрабаванымі на медыйным рынку. І каб папяровая версія «Сельской газеты» паралельна з электроннай паспяхова развівалася. Так хочацца, каб з раніцы кожны ахвотны змог адчуць асалоду ад свежага друкаванага нумара любімага выдання...

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Завод «ЭВИСТОР» 210101, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81 тел.: 8 (0212) 55-11-81, 8 (044) 5941732.

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 200/С-73624, площадью 4211,2 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/18, наименование – здание столовой, назначение – здание специализированное для общественного питания, составные части и принадлежности: рампа, ступени, находящееся на зем. участке с кадастровым № 240100000001002628 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81 (право аренды).

**Нач. цена:** 44 800,00 бел. руб. без учета НДС**. Задаток**: 4 480,00 бел. руб.


Важны кірунак гарадскіх інвестыцый — далейшае развіццё транспартнай сферы. У прыватнасці, 200 мільёнаў рублёў пойдзе на працяг будаўніцтва Мінскага метрапалітэна. Таксама запланаваны істотныя выдаткі на развіццё інжынерна-транспартнай інфраструктуры ў раёнах жылой забудовы, узвядзенне першага гарадскога транспартнага кальца, на работы па добраўпарадкаванні сталіцы.

Як вынікае з праграмы, сёлета масавае будаўніцтва жылля для грамадзян, якія стаяць на ўліку на паляпшэнне жыллёвых умоў, будзе весціся ў мікрараёнах Чыжоўка, Лошыца, у межах вуліц Шаранговіча — Гарэцкага, Шышкіна і Куляшова.

Прадугледжана фінансаванне праектаў пажарных дэпо ў раёне вуліцы Адзінцова, у комплексах «Мінск-Мір» і «Маяк Мінска».

У рабоце сесіі ўзялі ўдзел старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец і старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей Сівец.



**Леанід ТУГАРЫН.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 14 студзеня 2021 года.

# Слухаць сняжынкі, сачыць за ростам травы

## Янка Сіпакоў не любіў тусовак і лічыў адзіным багаццем кнігі

**«Я не набыў вялікіх скарбаў, ні золата, ні дыяментаў, але ў мяне ёсць адна каштоўнасць — кнігі. Кнігі — мае сябры. Я збіраў іх усё жыццё і, як адзначаюць знаўцы, гэта, бадай, самая лепшая бібліятэка ў Мінску. Я падараваў сваіх сяброў вам, каб у іх з'явілася многа сяброў-чытачоў».**

Гэтак выказаўся пісьменнік Янка Сіпакоў, калі перадаваў сваю бібліятэку землякам з Аршаншчыны, а было ў ёй больш за пяць тысяч тамоў... Пакінуў Сіпакоў і «падарожныя нататкі» па той бібліятэцы — эсэ «Мая бібліятэка», у якім цытаваў улюбёныя творы, пераходзячы ад паліцы да паліцы...

Вось ужо дзесяць гадоў, як пісьменнік Янка Сіпакоў застаўся ў сваіх кнігах — і тых, што падарыў, а найперш, у тых, што напісаў... А споўнілася б яму сёння 85 гадоў.

Калісьці англійскі даследчык беларускай літаратуры Арнольд Макмілін заўважыў: «У паслясталінскі перыяд эксперыментальная паэзія асацыявалася пераважна з фігурай Янкі Сіпакова, якога неаднакроць як расхвальвалі, так і бэсцілі».

Сапраўды, гэты сціплы, інтэлігентны чалавек, які пазбягаў тусовак і перформансаў, адважваўся ў сваёй творчасці на тое, пра што ў іншых і думкі не ўзнікала... Навошта эксперыментаваць, ламаць межы, наклікаць на сябе непрыемнасці ідэалагічнай цэнзуры, калі і так выдаюць і кормяць?

А ён то пісаў вольным памерам балады, то перакладаў Хлебнікава, то браўся за прыпавесці і фантастыку... Таму што калі паэт услухаецца ў жыццё, «абавязкова заўважыць, як віхуры сусветаў даўніх насілі яго калыску, як самі зоркі ўступалі яму месца».

### «Люблю цішыню...»

Калі ён прыходзіў у мой колішні рэдакцыйны кабінет, заўсёды сумна здзіўляўся, як тут тлумна ды мітусліва... І праўда, заўважалася, як яму некамфортна ў такім месцы. І на пытанне інтэрв'ю, якое мы тады рабілі, — «Хто ваш найбліжэйшы сябар?», — Іван Данілавіч адказаў: «Цішыня. Таму што шум ды тлум — мае ворагі. Не ўваходжу ні ў якія тусоўкі, таму што яны — таксама шум».

Дарэчы, інтэрв'ю Сіпакоў даваць таксама не любіў. А на пытанне, ад каго ён стамляецца больш за ўсё, адказаў: «Ад цікаўнага чалавека».

У ім шмат было ад усходняй філасофіі з уменнем сузіраць, углядацца ў Сусвет, атаясамліваць сябе з каменем, дрэвам, ветрам, бачыць у кроплі мора... Згадзіцеся, далёка не кожны адкажа, што ягоны ўлюбёны пах — «тонкі пах квітнеючай бульбы. Гэта цуд...» А ўлюбёную пару года вызначыў зноў-ткі сімвалічна: «Цішыня жоўтай восені».

І не кожны ўмее, гледзячы на снегапад, бачыць асобныя сняжынкі — зусім як асобных людзей у натоўпе...

*«Сняжынкі былі такія бязважкія, што не падалі на зямлю, а, наадварот, падымаліся ўверх. Некаторыя з іх мітусіліся, здавалася, зусім бязладна, таўкліся перад акном, і не трэба было ўважліва прыглядацца, што ім карціць зазірнуць у мой пакой. Я ж, пакуль яны мітусіліся за шклом, чакаючы сваёй чаргі, паспеў разгледзець, што яны крылатыя. І крыльцы ў іх такія ж пухнатыя і бязважкія, як і яны самі».*

Сузіраў ён снегапад, сузіраў і сады:

*«На сад заўсёды прыемна глядзець.*



*Гляджу раніцою ў добрае, цёплае і сонечнае надвор'е. Навокал ціха-ціха, не варушыцца ніводзін лісток. І раптам, як усё роўна жывая, затрапеча, заб'ецца аж цэлая галінка ў нейкім сваім, толькі ёй вядомым клопаце, — ветру няма, а здаецца, што нехта дзьме на яе знарок.*

*Гляджу ўдзень, назіраю, як лапоча па лісці, па яблыках, сцякаючы пад іх кроплямі, буйны і халодны дождж, як амаль ад кожнай дажджыны ўздрыгваюць яблыкі — ці то і праўда ад кропель, ці гэта проста згінаюцца, хістаюцца, спружыняць танчэйшыя галіны.*

*Гляджу ўвечары, калі раптам памацнее чамусьці вецер — звычайна к вечару нармальныя вятры сціхаюць, — і любуюся, як асцярожна, плаўна — і гэта пад такім ветрам! — гайдаюцца галінкі яблынь: менавіта так, ласкава, маці люляюць на руках сваіх немаўлят. І думаю: «Ага, і яблыкі — гэта ж таксама дзеці яблынь, таму дрэвы так шануюць і берагуць іх».*

### Сусвет пачынаецца ў Зубрэвічах

*«Маё карэнне — вёска Зубрэвічы, звычайная вёска на Аршаншчыне. Яна прытулілася да перасохлай Вуллянкі, якая ўспамінае, што была некалі сапраўднай ракою, хіба толькі падчас дружнага веснавога разводдзя».*

Іван Данілавіч пяшчотна любіў свае Зубрэвічы. Прычым учыняў, як Несцерка, які на пытанне, дзе цэнтр зямлі, тыцкаў кіем сабе пад ногі: «Тут, дзе я стаю! Перамерай, калі не верыш!»

Ён усе адлегласці адмяраў ад роднай вёскі. Падчас купалаўскага юбілею пісаў эсэ пра маршрут «Ляўкі — Зубрэвічы», залічваючы Купалу ў землякі... У рамане-містыфікацыі ў апавяданнях «Зубрэвіцкая сага» стварыў неверагодныя гісторыі, дзеянне якіх адбываецца ў Зубрэвічах у розныя эпохі. Нават міфічнага летапісца князя там пасяліў. *«І не нейкі там князь, а Мітка Сякіра, Дзмітрый Зубрэвіцкі. Ён быў вядомы асобаю. Князь Дзмітрый жыў у XV стагоддзі, а яго добра памяталі і ў XVI стагоддзі, і пазней. Ян Длугаш, вядомы польскі храніст, што пра Грунвальд пісаў, пра нашага князя ўспамінае, «Хроніку Быхаўца» згадвае... А жыў ён у Зубрэвічах. Тут яго маёнтак знаходзіўся».*

Чаго толькі не адбывалася, паводле Івана Данілавіча, у ягоных Зубрэвічах! І ведзьмаў палілі, і паўстанцаў лавілі...

А вось у эсэ пра сваю хатнюю бібліятэку Сіпакоў заўважае на паліцы зборнік Гумілёва... А там згадка пра эфіопскага цара Менеліка.

«Цар цароў? Сам негус? Пра імператара Эфіопіі Менеліка II я ўжо сёе-тое ведаў. Дзякуючы беларусу Аляксандру Булатовічу, — гусару, удзельніку Расійскага экспедыцыйнага корпуса ў Абісініі, які з войскам цара цароў прайшоў усю Эфіопію, аж да возера Рудольфа. У гэтым паходзе ён вёў эфіопаў! Булатовіч быў асабістым госцем Менеліка, Менелік узнагародзіў яго залатым шчытом і шабляю. «Я паслаў на вайну з расам Вальдэ Георгісам Аляксандра Булатовіча», — паведамляе цар цароў у Расію.

Булатовіч напісаў успаміны «З войскам цара цароў». Дзякуючы яму, чытаючы яго кнігу, і я прайшоў разам з імі той і складаны, і цікавы шлях па Афрыцы.

І таму каментарыі, якія зрабіў да паэмы «Мік» сам Гумілёў, мяне парадавалі, бо амаль усё з іх, што ён тлумачыць, я ведаў. Ведаў, што Аўта-Георгіс — ваенны міністр Абісініі, які вырас да гэтай пасады з рабоў; што Гурабе, маленькае негрыцянскае племя на паўднёвай мяжы Абісініі, якое захопліваў і Булатовіч; што Менелік — абісінскі негус; што негус — гэта цар; што Харар — горад у Абісініі: ад Харара да Энтата Булатовіч ехаў наперадзе войска; што тэдж — гэта абісінскае піва, любімы напітак эфіопаў.

Дзякуючы земляку мне ўдалося напісаць сваё афрыканскае апавяданне, якое ўвайшло ў кнігу «Зубрэвіцкая сага».

А калі ў гутарцы я спытала пра лецішча, Іван Данілавіч адказаў: *«Ёсць у маіх родных Зубрэвічах старая, яшчэ дарэвалюцыйная, хата і сем сотак гарода каля яе. Вырошчвае там усё жонка. А я люблю садзіць усё, што расце. І якая розніца, што аддаваць зямлі: цыбулю альбо гарбуз, капусту ці памідоры, кабачкі ці агуркі. Галоўнае, каб зернейка прабілася на паверхню і, быццам два крылы, распасцерліся над зямлёй два зялёныя лісткі».*

Дарэчы, сваю кнігу пра Беларусь ён назваў «Зялёны лісток на планеце Зямля».

### «Сіпакоў даў ладнага выспятка паэтам майго пакалення»

Быў у Янкі Сіпакова вядомы зямляк, яшчэ адзін літаратар з пакалення шасцідзясятнікаў — Уладзімір Караткевіч, ягоныя карані таксама былі звязаныя з Аршаншчынай.

Здарылася так, што Сіпакову ў маладосці, яшчэ студэнтам БДУ, давялося зрабіць, так бы мовіць, экзістэнцыяльны выбар... Бо прапанавалі яму далучыцца да абуранага хору супраць «нацыяналіста» Уладзіміра Караткевіча, які ў сваіх творах «прапагандаваў буржуазную рамантыку». Сіпакоў браць удзел у цкаванні адмовіўся, хоць гэта пагражала выключэннем...

Караткевіч пасля так падпіша яму сваю кнігу «Зямля пад белымі крыламі»: «Дарагому другу і земляку ва ўсіх сэнсах (і па зямлі і па сэрцу) Янку Сіпакову на добры ўспамін. Ул. Караткевіч. 21 лютага 1978 г.» Дарэчы, сваё эсэ «Зялёны лісток на планеце Зямля» Сіпакоў напісаў, безумоўна, пад уплывам таго эсэ, толькі адрасаваў больш маладому чытачу... А калі выйшла кніга Сіпакова «Веча славянскіх балад», Караткевіч напісаў на яе рэцэнзію, якую назваў «Справядлівасць». Там былі радкі: *«Гэты хлопец, сам таго не жадаючы, даў ладнага выспятка паэтам майго пакалення, і ў тым ліку мне. І дзякуй богу. Свет, дзе няма месца нечаканасцям — гэта не свет. І кніга гэта добра паслужыць людзям і Беларусі».*

Караткевіч расказвае, як браў «Веча» з сабою ў Крым, як зборнік чыталі людзі розных нацыянальнасцяў і заставаліся пад уражаннем. «Сібірак перадрукаваў "выбранае" на машынцы, ставячы адзінку замест «і». Ленінградзец завучвае «Лазню» і «Еш!» на памяць, просіць выправіць вымаўленне, перапісвае. І ўсе, чалавек дзевяць, просяць самую кнігу».

*«Пра мастацкія якасці кнігі казаць не буду. Агромністая задача, якую ўзваліў аўтар на свае плечы, не магла быць выканана не мастаком. Скажу адно: нездарма пасля назвы стаіць не «вершы», а «паэзія». Гэта і ёсць сапраўдная, чыстай вады, паэзія.*

*І пад канец хачу дадаць яшчэ толькі адно.*

*Перасцярогу. І вельмі сур'ёзную. Па тым, як аўтар размахнуўся, як яму ўдалося ўдарыць, ён стварыў дзеля сябе і нас, дзеля грамадства адну з кніг свайго жыцця. Ці будуць у яго іншыя — залежыць толькі ад яго аднаго.*

*Але пасля такой кнігі ён проста не можа... ды не, проста ніхто ад яго не пацерпіць вершаў слабых, вершаў хаця б напалову хлуслівых, вершаў — фігавых лісцікаў».*

«Веча славянскіх балад» сапраўды вытрымала выпрабаванне часам, хоць Караткевіч слушна заўважае, што гэта — «поўная жудасці, страшная кніга, нягледзячы на некаторыя рэверансы ў бок жарту, пераможныя песні і г. д...»

«Гэтая кніга ўся — адзін аголены нерв. Гісторыя пакуты... Вязні адкормліваюць, каб быў моцны дзеля расправы з наглядчыкам, вязня, не ведаючы, што ён правакатар («Еш!»).

Жанчыны труць перац (сыпаць у вочы гвалтаўнікам, таму што мужчыны пабітыя і бараніць няма каму). Адпраўляюць у выгнанне чалавека за тое, што ён хоча лётаць. Сляпы аркестр рабоў грае перад эмірам, ведаючы, што на эмірскі ложак усходзяць тыя, каго яны, рабы, любяць... Але пры гэтым «Валы» — гэта яшчэ і людзі, што йдуць на смерць. «Крылы» — гэта ўсё ж апафеоз чалавеку, які ўзляцеў. «Конь» — гэта яшчэ і разіншчына. «Рэха» — гэта яшчэ і гераізм адзіночнай барацьбы».

А галоўнае, што закранула Караткевіча ў «Вечы», — абвостранае пачуццё справядлівасці, якое не пакідае найлепшых людзей і ў самыя чорныя часы. Так, Караткевіч адчуваў у Сіпакову не проста сябра — але аднадумца, паплечніка, беларускага патрыёта... «Стой горда... Сёння яны запаляць з нас такі касцёр, які ім у вякі-вякоў не пагасіць».

### Уітмен і голас травы

Калі Іван Данілавіч аднойчы прыйшоў у госці да суполкі маладых літаратараў «Літаратурнае прадмесце», адно з першых пытанняў — пра ягоныя пераклады... Бо гэта быў незвычайны выбар аўтараў: ад Хо Шы Міна да Уолта Уітмена... «Лісце травы» — творсімфонія, напоўнены філасофскай сімволікай і складанай мелодыкай... «Лісце травы» ў перакладзе Сіпакова выйшла ў «Мастацкай літаратуры» ў 1978 годзе (з выданнем праблем не было, бо Уітмен лічыўся прыхільнікам сацыялістычных ідэй). Але яшчэ ў 1969-м у часопісе «Маладосць» было надрукавана эсэ Сіпакова пра Уітмена *«Вершаруб з доўгай выспы»: «У кожнага чалавека (тым больш у паэта), мусіць, бываюць такія моманты, калі ён раптам міжвольна адчувае, што жыццё пачалося не з тае хвіліны, калі ён нарадзіўся, што да яго было ўжо ўсё: і сама зямля, і людзі на ёй. І тады ён абавязкова ўзнімецца над звыклай зямлёю, каб зірнуць на яе і на сябе з вышыні стагоддзяў:*

*«Цяжка і доўга сусвет працаваў, каб стварыць, нарэшце, мяне...»*

У Сіпакова вельмі шмат сугучнага з Уітменам... І не толькі ў любові да верлібра. *«Дзе ты, мой непасрэдны свет высокай-высокай травы, далёкага неба і вельмі блізкіх кузюрак?!*

*Там трава настолькі высокая, што ты хаваешся ў ёй з галавою і, каб убачыць, куды адышлася маці, узнімаешся на дыбачкі, а мяцёлкі слёзак і цімафееўкі, таўкачыкі трыпутніку і шчаўлюку, чырвоныя, вялізныя мячыкі канюшыны, нагрэтыя сонцам, прыемна так казычуць твар, пакідаючы надоўга пах пылку, мёду, зеляніва і цеплыні»* — гэта Янка Сіпакоў пра сваё дзяцінства. А ў «Зубрэвіцкай сазе» яго герой, «як нешта зразумеўшы», моўчкі загаварыў з травою.

*«Трава таксама ж жывая, і ёй баліць. Колькі пакаленняў травы прайшло паперадзе вось гэтай купінкі! Кожную вясну нараджаліся травінкі, радаваліся свайму з'яўленню, квітнелі, цягнуліся да сонца, а ўвосень ціха, хоць і не заўсёды паслухмяна, паміралі — часам і з-пад сумётаў на маразы і завеі настойліва, як і цяпер вось, вытыркаліся зялёныя касцічкі».*

### Мора, якое заўсёды з сабою

Сіпакоў часта распавядаў гісторыю, як мог стаць маракам. Падчас вайны ён страціў бацькоў, іх пакаралі за сувязь з партызанамі. Яго з дзвюма ягонымі сёстрамі выхоўвала цётка Аляксандра Іванаўна, бацькава сястра. І вось пасля вайны прыйшла разнарадка на Аршанскі раён: дзяцей, круглых сірот, адправіць у нахімаўскую вучэльню. Выбралі Івана Сіпакова. Жылі бедна — цётка «ніколі не выбіралася з нядоімак, заўсёды была нешта вінавата дзяржаве: ці то воўну, ці то яйкі, ці то мяса. Мне нават самому давялося ссякаць свой сад — слівы, вішні і яблыні, — бо на той час кожнае дрэва было абкладзена такім падаткам, выплаціць які мы, канечне ж, не маглі... Але ж цёця мяне не аддала: «Ай, няхай будзе са мною».

*«Нязведаная гэта штука — чалавечы лёс! А каб не пашкадавала, каб аддала? Можа, з мяне атрымаўся б нядрэнны марскі афіцэр і ў свой час я меў бы ўжо асабісты караблік і, як жартую сёння, кіраваў бы ім: «Лева руля! Права руля! Так трымаць!» Пра гэта думалася ва Уладзівастоку, на Ціхаакіянскім флоце, дзе я, лейтэнант запасу, праходзіў перападрыхтоўку і дзе мне было вельмі цікава пазнаёміцца амаль з усімі ваеннымі караблямі. Ды і марская форма, кажуць, мне была да твару...»*

На пытанне пра інтэлігентнасць Сіпакоў адказаў, што гэта павінен быць нармальны, штодзённы і штохвілінны стан кожнага чалавека: далікатнасць, уважлівасць, прыстойнасць.

Што ж, ён быў інтэлігентным чалавекам, які звяртаўся да нас усіх:

*«Спыніся хоць калі-небудзь, чалавеча. Азірніся на прыгажосць усяго, што каля цябе, над табою, пад табою. Пастой. Паглядзі, падумай.*

*Ты думаеш, што жыццё там,*
*куды ты бяжыш?*
*Не! Яно толькі з табой —*
*у тваіх думках і ў тваіх вачах.*
*Так што глядзі і думай,*
*пакуль жывеш.*
*Не спяшаючыся».*

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# КАЛІ МАЦІ ЯК ДЗІЦЯ...

**Памятаеце, быў такі фільм «Рабро Адама», дзе галоўная гераіня, якую іграе непараўнальная Іна Чурыкава, разрываецца паміж асабістым жыццём і сваёй часткова паралізаванай маці? Старая не дае дачцэ ніякага продыху, патрабуе пастаяннай прысутнасці, а ў канцы фільма, калі на яе настойлівыя спробы звярнуць на сябе ўвагу ніхто не рэагуе, нечакана ўстае з ложка і з'яўляецца перад вачыма збянтэжаных дамачадцаў. Глядзіш на гэты жах і думаеш: Божа, пранясі міма мяне гэтую чашу. Але тут нічога ад нас не залежыць. Як кажуць нашы сённяшнія суразмоўцы, гэта крыж і мы павінны будзем яго панесці.**

## ХВАРОБА АБО МАНІПУЛЯЦЫЯ?

Што рабіць, калі нечакана маці або бацька сталі вельмі настойліва заяўляць пра сябе? Ім ужо не хапае ранейшай увагі, яны штодзённа па некалькі разоў у любы час дня і ночы тэлефануюць і загадваюць неадкладна прыехаць, бо яны «адны, нікога побач няма, усё прападае і наогул праз пяць хвілін могуць памерці». Праклятая дэменцыя адымае ў нас родных, любімых і дарагіх. Замест іх у гэтых нядужых ужо целах пасяляюцца нейкія жахлівыя монстры, і ты не ведаеш, як сябе з імі паводзіць.

— Насельніцтва старэе, і такі дыягназ, як дэменцыя, або хвароба Альцгеймера, прыходзіцца ставіць даволі часта, — адзначае **намеснік урача па медыцынскай частцы Магілёўскай абласной псіхіятрычнай бальніцы Павел ГАЛАВАЧ.** — Па статыстыцы ад дэменцыі пакутуе 20 % насельніцтва планеты, прычым 5 % — у цяжкай форме. І часцей за ўсё прычынай захворвання з'яўляюцца сасудзістыя праблемы: ціск, гіпертанічныя захворванні, інфаркты, інсульты, парушэнне мазгавога кровазвароту і гэтак далей. З часам артэрыяльныя сасуды пашкоджваюцца і паяўляюцца парушэнні кагнітыўныя, то-бок разумовай дзейнасці. Чалавек пачынае блытацца ў сабе, у месяцы, пары года, не спраўляецца з простымі рэчамі, паяўляецца нейкая бездапаможнасць. Пры сасудзістай дэменцыі назіраецца плаваючая сімптаматыка. Сёння ён можа быць дззарганізаваны і бездапаможны, а заўтра, калі спазм сасудаў прайшоў, адэкватна рэагуе на ўсе знешнія раздражняльнікі. Здаецца, усё прайшло. Назаўтра якая-небудзь магнітная бура, ціск — і зноў усё па новай. У лёгкай дэменцыі чалавек можа пражыць доўгі час і непрыкметна сысці, нават не здагадваючыся, што хворы.

Да псіхіятра справа даходзіць тады, калі ў чалавека праяўляюцца псіхічныя моманты: агрэсія, галасавыя або зрокавыя галюцынацыі. Тады родныя б'юць трывогу і высвятляюць, што рабіць. У гэтым выпадку псіхіятр назначае купіруючыя прэпараты і карэктуе паводзіны.

— Дысцыркулятарная энцэфалапатыя — надзвычай распаўсюджанае захворванне, якое ёсць амаль у кожнага, яго трэцяя ступень у некаторых выпадках і ёсць дэменцыя, — кажа Павел Галавач. — Адбываюцца парушэнні ў галаўным мозгу, што паступова прыводзіць да дэградацыі. Ёсць спецыфічныя прэпараты, якія паляпшаюць якасць жыцця, і яны прымаюцца пастаянна.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Але медыцына займаецца гэтымі пацыентамі толькі тады, калі пастаўлены дыягназ. Бо калі дэменцыя — гэта хвароба, то старэчыя ўзроставыя змяненні — норма. Калі чалавеку пад 90, ён дзесьці забываецца, памятае добра толькі сваё мінулае. А дэменцыя — ужо інваліднасць, аж да І групы.

**Ці можна пазбегнуць такога дыягназу? Наогул, ці магчыма ў гэтым выпадку нейкая прафілактыка? Можа, трэба трэніраваць памяць? Вучыць вершы, напрыклад?**

— Гэта не дапаможа, калі дэменцыя ўжо пачалася, нейрамедыятары не аднаўляюцца, — канстатуе ўрач. — Прафілактыка сасудзістай дэменцыі — гэта прафілактыка атэрасклерозу. Але гэтым трэба займацца з маладосці. Бо калі ў 60 гадоў у чалавека інфаркт, інсульт, цукровы дыябет і цэлы «букет хвароб», якія прыводзяць да пашкоджання сасудаў, то тут ні пра якую прафілактыку не можа нават ісці размовы.



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

ok.ru—3

Такі чалавек будзе з кожным днём забіраць усё больш увагі. І з гэтым трэба змірыцца. Адзінае, што можна зрабіць, гэта запаволіць працэс распаду асобы з дапамогай медпрэпаратаў, якія павінен назначыць спецыяліст. Пажадана, каб родныя з разуменнем падышлі да сітуацыі і арганізавалі для хворага чалавека найбольш камфортныя ўмовы пражывання, кантралявалі рэжым яго дня, сачылі за гігіенай. Такія людзі дззарыентаваныя толькі таму, што жывуць без догляду. І Канстытуцыя, і грамадзянскі доўг патрабуюць шанаваць роднага чалавека. Але тут усё залежыць ад сумлення, унутрысямейных каштоўнасцяў.

## КАЛІ НЕ МОЖАШ ЗМЯНІЦЬ СІТУАЦЫЮ, ЗМЯНІ СТАЎЛЕННЕ ДА ЯЕ...

Для сям'і родныя з прыкметамі дэменцыі — заўсёды стрэс, і тут вельмі вялікую дапамогу аказваюць сацыяльныя работнікі. Яны часткова бяруць цяжар гэтых наступстваў на сябе.

На абслугоўванні Магілёўскага раённага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва 530 кліентаў. Сацработнікі па месцы працаўладкавання праходзяць спецыяльны «курс маладога байца», каб ведаць, як паводзіць сябе з такімі асаблівымі грамадзянамі. Наконт хворых з дыягназам тут інфармацыі няма, але капрызных і сварлівых хапае, адзначае **загадчык аддзялення сацыяльнай дапамогі дома Таццяна СТАЛЯРОВА.**

— Прыходзіцца выслухваць ад іх усякае, — кажа яна. — Некаторыя ледзь не ноччу тэлефануюць нашым работніцам і патрабуюць, каб паслуг ім аказвалі больш, чым значыцца ў нашым пераліку. Нават дзеці баяцца мець зносіны са сваімі старымі бацькамі — на нас спадзяюцца. Часцей за ўсё менавіта мы ім прапануем знайсці нейкае выйсце. Разумеем, што іх блізкія — людзі хворыя і паводзяць сябе так не спецыяльна, каб зрабіць шкоду, а таму што ў іх інакш не атрымліваецца.

Звычайна сацработнік знаходзіцца ў распараджэнні кліента да 2,5 гадзіны, але ў некаторых выпадках, па медыцынскіх паказаннях, можна скарыстацца паслугамі сядзелкі: яна застанецца побач нават восем гадзін у суткі. Такіх на абслугоўванні цэнтра 12 чалавек. Канешне, паслуга платная, але што ні зробіш для роднага чалавека! На сёння пры ўмове, што сацработнік знаходзіцца ў кліента ўсе восем гадзін у дзень, прыйдзецца аддаць прыкладна 180 рублёў у месяц.

Калі трэба, сацслужба можа пахадайнічаць наконт сацыяльнага ложка ў бальніцы, дзе ёсць аддзяленне дзённага знаходжання. Раз на два месяцы ў раённым цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва такія кліенты з'яўляюцца. Дапамогуць тут сабраць дакументы і для пераезду старых у дом-інтэрнат. Але, як сведчыць спецыяліст, мера гэта крайняя і на яе родныя старых ідуць даволі рэдка. Прычыны часцей за ўсё спецыфічныя.

— Запомнілася, як сын збіраў дакументы на свайго бацьку, — згадвае Таццяна Сталярова. — Стары яго не выхоўваў, аліменты на яго не плаціў, а потым зваліўся як снег на галаву. Сын адразу ж выказаўся за дом-інтэрнат. Праўда, на этапе афармлення дакументаў пажылы мужчына памёр. У іншым выпадку менавіта сыну прыйшлося б плаціць за догляд бацькі ў інтэрнаце. А гэта немаленькія сродкі.

Мы любім сваіх бацькоў, пакуль яны дужыя і моцныя, жадаем ім жыць да ста гадоў і больш. А калі яны ўпадаюць, мякка кажучы, у дзяцінства, крычым, маўляў, каравул, што рабіць?!

— Невядома яшчэ, якія мы будзем у старасці, — рэзюмуе вядучы **псіхолаг Магілёўскай абласной псіхіятрычнай бальніцы Ірына БАРАНОЎСКАЯ.** — І трэба разумець, што нашы дзеці, калі мы будзем такімі ж старымі, змогуць дрэнна адняосціся і да нас. Нам гэта трэба? Што перашкаджае тэлефанаваць старым бацькам кожны дзень? Ім вельмі важна адчуваць сябе патрэбнымі. А калі дзеці самі на мяжы псіхозу ад неабходнасці выконваць новыя для іх абавязкі, то ім трэба ісці да спецыяліста, каб расставіць усе кропкі над «і». Трэба зразумець: тое, што здарылася з іх бацькамі, — хвароба. Не будзеш жа злавацца на чалавека, які без ног і не можа хадзіць. Аднойчы да мяне звярнулася вельмі самадастатковая дама. Яна паскардзілася на тое, што яе турбуе старая маці, з якой яна не жадае размаўляць. У дзяцінстве тая ўвесь час яе прыніжала і цяпер спрабуе даваць непатрэбныя ёй парады. Пры гэтым маці не дэментная, проста зануда. Я прапанавала яе дачцэ прааналізаваць сітуацыю ад зваротнага. Вельмі часта дзякуючы суровым бацькам дзеці дасягаюць вышынь, каб даказаць, што яны не слабыя або дрэнныя. Як кажуць, тое, што нас не забівае, робіць нас мацнейшымі. Хапіла двух сеансаў, каб яна без трымцення змагла ўспрымаць званкі маці. Кліентка пагадзілася, што яна б нічога ў жыцці не дасягнула, калі б яе ўвесь час гладзілі па галоўцы. Яна змяніла стаўленне да сітуацыі і гэтым выратавала сябе.

## ВЫПРАБАВАННЕ НА ТРЫВАЛАСЦЬ

Адна справа — родная маці або бацька, а калі гэта цешча або свякроў? Калі ўзнікае неабходнасць забраць чужых, па-сутнасці, людзей на агульную з мужам (жонкай) жылплошчу, у сям'і можа адбыцца катастрофа. Нягодны з такой рэчаіснасцю чалавек можа пачаць піць або возьме і падасць на развод. Ці не занадта высокая цана за жаданне аднаго з членаў сям'і выканаць свой доўг перад старымі бацькамі?

— Сапраўды, бывае, што дапамога патрэбна не бабулям, а тым, хто іх дагледае, — кажа **магілёўскі псіхолаг Тамара КАЗЫРА.** — У кожнага свой парог цярпення, як і болевы. Сярод маіх кліентаў была сям'я з хворым дзіцем, якая не ведала, адмовіцца ад яго ці не. Але ім трэба было рашыцца, ці змогуць яны жыць, ведаючы, што іх малы дзесьці не з імі. Яны прызнаваліся: мы і так не зможам, і гэтак. Але ўсё ўжо здарылася, назад ужо не павернеш: хворае дзіця існуе. І тут любы крок будзе правільны, але з гэтым трэба будзе навучыцца жыць. Нам заўсёды даецца тое выпрабаванне, якое мы рэальна можам вытрымаць. Ёсць прытча пра крыжы, у якой чалавек прыйшоў да Бога і папрасіў сабе лягчэйшы. Той дазволіў выбраць. Чалавек перабраў шмат розных крыжоў, а потым усё ж такі вярнуўся да свайго. Калі так склалася жыццё, гэта для чагосьці трэба. Выпрабаванні даюцца для таго, каб зрабіць нас больш трывалымі. У жыцці не можа быць усё гладка. Таму калі не ведаеце, як жыць, калі маці ці бабуляназаляюць, ідзіце да спецыяліста і высвятляйце, у кім на самай справе праблема. Мы парад не даём, мы проста размаўляем, а выбіраць чалавек будзе сам. Старыя людзі могуць ствараць праблемы, дарэчы, як і ўсе мы.

Казка «Папялушка» ў гэтым выпадку вельмі павучальная. Шчасце атрымала тая з сясцёр, ад якой увесь час нешта патрабавалі. Гэта была ўзнагарода за яе цярпенне.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Крымінал

# «Алена» аказалася зусім не прыўкрасная

**Жыхар Маладзечна пад жаночым імем у інтэрнэце ўцягнуў 16-гадовую дзяўчыну ў занятак «найстаражытнейшым рамяством».**

У ходзе аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў супрацоўнікі Маладзечанскага РАУС выйшлі на беспрацоўнага 30-гадовага мясцовага жыхара, які схіліў 16-гадовую дзяўчыну да інтым-паслуг, заплаціўшы ёй 25 рублёў. Па інфармацыі УУС Мінаблвыканкама, сваю ахвяру мужчына «апрацоўваў» на сайце знаёмстваў, дзе кантактаваў з непаўналетній пад жаночым імем Алена.

«Незнаёмка» па той бок экрана лёгка ўвайшла ў давер да дзяўчыны і неўзабаве распавяла аб сваім лёгкім заробку. Асабістая перапіска паміж імі ішла і ў сацыяльных сетках, дзе мужчына быў зарэгістраваны пад імем і дзявочым прозвішчам сваёй жонкі. У ходзе размовы мужчына стаў схіляць дзяўчыну да аказання сексуальных паслуг, прычым пра яе ўзрост яму было дакладна вядома. Паддаўшыся на ўгаворы, тая пагадзілася на рамантычнае спатканне за плату. Першага кліента для дзяўчыны знайшла «Алена», якая, уласна, гэтым кліентам і аказалася, але ўжо ў сваім сапраўдным мужчынскім абліччы.

Дзеяннем мужчыны, які падштурхнулі непаўналетнюю да ганебнага рамяства, дадзена прававая ацэнка. Яму пагражае да дзесяці гадоў пазбаўлення волі са штрафам. Дарэчы, раней ён ужо быў судзімы за п'янае кіраванне транспартным сродкам, таксама прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за правапарушэнні ў сферы сямейна-бытавых адносін.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**




## НАДВОЕ БАБКА ВАРАЖЫЛА...

### А ДЗЕЎКІ — НА АДНО

Што ўчора было, я часам не ўспомню, а вось што ў маладосці — з дарагой душой.

Значыць, некалі перад старым Новым годам нашы дзяўчаты сабраліся варажыць. Для гэтага бліжэй да вечара яны сышліся да Волькі (яе бацькі былі ў госці з'ехаўшы) і пачалі...

Пачалі з таго, што рушылі пад павець: кожная ўзяла там па ахапку дроў, прынесла ў хату і ўжо там падлічыла.

Цотная колькасць паленцаў была толькі ў гаспадыні, у той самай Волькі. Выходзіла, што замуж у новым годзе пойдзе хіба яна?

Сяброўкам таксама хацелася. Таму кожная з іх насыпала па горцы проса, а Волька рушыла ў куратнік па пеўня. Старэйшыя жанчыны казалі: чыё зерне ён пакаштуе раней, тую з дзяўчат першай замуж возьмуць.

Так лічылася, ды выйшла, на жаль, іначай. Волька на падлогу пеўня паставіла, а той, спужаны, у бок проса нават не глядзіць...

Волька тады качаргу ўзяла — хацела яго падштурхнуць. Певень жа з перапуду «на крыло» і лёпма па хаце. Дзяўчаты, бедныя, ледзь злавілі яго — занеслі назад.

...Такім чынам у іх заставаўся яшчэ адзін, апошні, спосаб варажбы.

Бліжэй да поўначы сяброўкі выйшлі з хаты. Перакананіся, што на вуліцы ціха (малыя калядоўшчыкі разышліся, у большасці хат нават вокны не свяцілася), і таму смела падбеглі да варот, разуліся і праз іх па чарзе сталі выкідваць на вуліцу свае боты-валёнкі (лічылася, куды насы іх павернуцца, туды гаспадынькам і замуж ісці)...

Варажбіткі тут жа хацелі выскачыць за брамку ды паглядзець, як з-за плота пачулася грознае:

— Э-э-э, — хто там хуліганіць? Хто чым кідаецца?

Дзяўчаты аслупянелі: дзед Алесь... Адкуль яго прынесла?.. А галоўнае — калі «знясе», бо трэба ж як найхутчэй забраць абутак — холадна стаяць на снезе.

Дзед, мяркуючы па кашлі, урэшце сышоў. Дзеўкі тут жа на вуліцу. Ва ўсе вочы глядзяць там, снег нагамі абмацваюць — няма абутку.

Яны тады следам за дзедам...

А той ужо дадому прыйшоў ды кажа:

— Глянь, бабка, што я на вуліцы падняў. Ну ці ж не малайчына?

— Не, — агледзеўшы знаходку, смяецца ў адказ цётка Алесіха. — Ты проста бязмен... Гэта ж дзеўкі недзе варажылі, а ты... Прызнавайся, ля чыйго падворка абутак падабраў?.. Ды я, здаецца, і сама ўжо ведаю? Вось гэта — Вольчыны румыначкі. Больш ні ў кога такіх няма! Цёплыя, на абцасіках...

Толькі палюбавалася ды Вольку ўспомніла, як яна з сяброўкамі на парог — прыйшлі спытаць, ці не бачыў дзед Алесь іхняга абутку?

Той, шчаслівы, давай ім расказваць, як ішоў дахаты ад кума, як убачыў, што нехта нечым кідаецца, як пакрыўдзіўся ды тое падабраў, як панёс...

Алесіха перапыніла. Сказала:

— Значыць, сёлета і вас, дзяўчаткі, таксама хлопцы падбяруць і павязуць ці панясуць. Пойдзеце вы замуж, але ж, як выглядае, не ў сваю вёску — некуды за свет...

Што цікава, так яно і атрымалася: павыходзілі гэтыя сяброўкі замуж, прычым хутка, адна за адной і ўсе — у іншыя вёскі. У сваёй ніводная не засталася.

**Ніна Кандрашонак,**

*г. Петрыкаў.*

## ПАКУЛЬ У НАС СТАЯЛА ШКОЛКА

Найперш добрым словам я хачу згадаць Пятра І, які падчас свайго праўлення выдаў указ аб святкаванні Новага года, аб тым, каб у гонар гэтага свята «ўчыняць» аздабленні з елак, забаўляць дзяцей ды катаць іх на санках з гор...

У выніку прыгожае атрымалася свята — са сваімі марамі і надзеямі, з яскравымі ўспамінамі.

У нашай вёсцы ў сярэдзіне мінулага стагоддзя яшчэ была свая прыгожая пачатковая школка. У трох класах яе займалася каля дваццаці вучняў. Там жа быў цэнтр культурнага жыцця: дарослыя збіраліся на сходы, лекцыі і канцэрты мастацкай самадзейнасці, глядзелі кінафільмы, а на Новы год вучняў і ўсю вясковую малечу чакала ёлка, вакол якой скакалі «зайчыкі» і «лісы», кружыліся «сняжынкі».

Тым разам маю найлепшую сяброўку ў шыкоўнай марлевай сукенцы і кароне, бліскучай ад наклеенага тоўчанага шкла, абралі Снягуркай. Было чым ганарыцца: задраўшы нос, яна круцілася каля Дзеда Мароза... Той, дзядзька Павел, хораша іграў на баяне, школьнікі перад бацькамі і дашкалятамі вадзілі карагоды, спявалі, чыталі вершыкі і, як водзіцца, атрымлівалі салодкія гасцінцы з дзедавага мяшка.

Пад канец свята настаўніца Ніна Васільеўна запрасіла да ёлкі і самых маленькіх. Яны пад бадзёрыя гукі баяна старанна расказвалі вершыкі пра зіму, пра ёлку ды зайку і, шчаслівыя, з цукеркамі ў кішэньках ішлі да бацькоў... Усім было цікава і весела!

Аднак далей нешта пайшло не так. Карапуз Васілёк раптам выдаў: «Дзед Мароз, чырвоны нос, не хадзі на горку, не куры ты папярос, а куры махорку!» і сарваў такія апладысменты, што яго прыклад натхніў... Снягурку. Тая рашуча пакіравала да ёлкі і на вясковай трасянцы звонка заспявала: «А курыца і пятух увалі-ліся ў катух. Стыдна стала петуху, што курыца навярху».

Дзед Мароз, пачуўшы гэта, ад нечаканасці рыпнуў мяхамі баяна, Ніна Васілеўна, як бурак, зачырванелася, усе дарослыя сталі душыцца рогатам.

Мы ж, дзеці, у гэтых выступленнях анічога такога не ўбачылі. Нам было проста радасна!

...І тады, і шмат гадоў пасля, пакуль у нас стаяла трохкласная і такая класная школа, пакуль было каму прыбірацца ў сняжынак і зайчыкаў ды кружыцца вакол навагодняй ёлкі.

**Т. Р.,**

*г. Наваполацк.*

## ДУМАЕШ АДНО, А ЯНО

### ПЕРАВЕРНЕЦЦА НА ДНО

Праўду кажуць: што жывеш, то вучышся. І нават будзеш вучыцца, пакуль смерць налучыцца. Не ведаю, пра вас гэта ці не, пра мяне — дакладна... А зрэшты, мяркуйце самі.

Еду я, значыць, у Віцебск, у горад, дзе некалі нарадзілася, дзе вучылася, дзе першы раз закахалася... Еду, усё ўспамінаю ды сама сабе ўсміхаюся.

— А вы гэта з чаго? — пытае ў мяне досыць прыгожая дзяўчына, што сядзіць насупраць.

— Ды рада, — кажу, — сустрэчы з горадам. Я — віцебская...

— І я, — усміхаецца дзяўчына. — Мяне Надзяй завуць... Да брата еду. Ён кватэру атрымаў. Улазіны спраўляе.

— Гэта добра, — кажу. — Мы таксама некалі «спраўлялі». Праўда, у бараках, зямлянках... Горад у вайну быў амаль што знішчаны...

Надзея слухае мяне ўважліва, нават зацікаўлена, як быццам... Але ж варта спытаць у яе, віцебскай, пра нейкія будынкі-мясціны, — маўчыць, як рыба: анічога не ведае.

Такім чынам жаданне размаўляць з ёй у мяне знікае, я разгортваю кнігу.

...За чытвом, незаўважна, мы пад'язджаем да горада. Я гляджу ў акно, хвалююся.

— Вас будуць сустракаць? — пытае раптам Надзя.

— Не, — кажу. — Я да сваццi еду, а яна — жанчына ў гадах... Сустрэць не зможа. Я нават не казала ёй пра свой візіт.

— А па мяне — брат павінен прыехаць! — хваліцца Надзея. — У яго машына свая. Калі хочаце, можам і вас падвезці.

Адмаўляцца, як быццам, не выпадае, тым больш што нам па дарозе. Я называю патрэбную вуліцу, вядомую ў Віцебску ўсім (можа, нават сабакам), але зусім... невядомую Надзі — і зноў нічога не разумею.

А таму, ужо на пад'ездзе да месца, шчыра дзякуючы за аказаную паслугу і выходзячы з машыны, усё ж пытаюся ў Надзі, чаму яна, віцебская, так не ведае гэты горад?

Дзяўчына міла ўсміхаецца, чырванее і прызнаецца:

— Ды я толькі другі раз тут... У мяне прозвішча такое — Віцебская.

Я ва ўсе вочы гляджу на дзяўчыну, яна — на мяне, і мы разам пачынаем смяяцца.

Надзін брат, мала што разумеючы, назірае на нас, потым круціць пальцам ля скроні і ціснe на газ. Машына знікае ў патоку іншых. Услед ёй я махаю рукой і думаю, як жа гэта няправільна — меркаваць пра чалавека (а тым больш рабіць высновы) з аднаго толькі першага погляду! Трэба — абавязкова — паглядзець другі раз.

**Зоя Наваенка,**

*г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

**Ад яе ж.** Як здагадаўся той, хто чытае нашу газету не першы месяц, з гэтай падборкі распачынаецца чарговы конкурс на найлепшую вясёлую і праўдзівую гісторыю з жыцця чытачоў «Звязды».

Вынікі папярэдняга пакуль падводзяцца і будуць абвешчаны ў самым хуткім часе. Журы — і вялікае чытацкае, і маленькае рэдакцыйнае — напружана працуе. Прызы пераможцам таксама рыхтуюцца.

Што застаецца чытачам? Ну вядома ж, чытаць (прабачце за паўтор) і пісаць, бо, як прызнаў нехта з класікаў, смеху баіцца нават той, хто не баіцца нічога. І, зноў жа, менавіта ім, смехам, выпраўляюцца норавы...

Калі жыць, то з надзеяй. Яшчэ і на гэта.

Неасабісты суб'ектыў



# Асаблівасці нацыянальнай «рыбалкі»

### Колькі каштуе самаўпэўненасць і боязь паказацца дурнем

Учора мне нарэшце патэлефанавалі віртуальныя махляры. Чаму нарэшце? Проста апошнім часам столькі давялося пра іх чуць і чытаць, што нават дзесьці прыкра было, што яны мяне сваёй увагай абмінаюць. Я ўжо і падрыхтавалася як мае быць — пытаннечкі ўсякія цікавыя задаць, а яны ўсё ніяк. І вось акурат пад стары Новы год — гэткі «падарунак» вырашылі зрабіць — загаласіў на смартфоне выклік у вайберы. Званіць мне ў гэтым месенджары толькі сяброўка з Германіі, а тут — цэлы BELARUSBANK на сувязі! Так і напісана было на экране, і аватарка адпаведная — зялёна-белая з жоўтым эмблема гэтага самага банка. Сур'ёзныя людзі, значыць, звоняць.

Глыбей удыхнуўшы і ўспомніўшы ўсе свае падрыхтаваныя фразы, зняла трубку. «Добры дзень. Служба бяспекі «Беларусбанка» вас непакоіць. Па дынаміцы вашага рахунку відаць, што ў вас спрабуюць спісаць усю суму...» — голас строгі, крыху занепакоены. «Чакайце-чакайце. А чаму вы тэлефануеце праз вайбер?» — «Справа ў тым, што мы званілі вам на мабільны, але з сувяззю нейкія праблемы. А дзейнічаць трэба тэрмінова, бо камп'ютарныя зладзеі спішуць вашы грошы беззваротна». — «Які жах! І што рабіць?» — «Хуценька паведаміце даныя вашай карткі, і мы яе заблакіруем». — «Малады чалавек, а вы не той самы махляр, які сам крадзе грошы?» — «Паслухайце, жанчына, пакуль вы тут сумняваецеся, мы губляем час. У такім выпадку ўсё пад вашу адказнасць. І пасля прэтэнзіі банку прад'яўляць не трэба». — «Добра. Яшчэ адно пытанне — і пайду па картку. Чаму ў вас вайбер на расійскім нумары? Вы што, з расійскага філіяла «Беларусбанка» тэлефануеце?» — «Як вы...» (далей адбой і кароткія гудкі).

З расійскім нумарам на вайберы, які і «дабіў» майго ветлівага і настойлівага суразмоўцу, што так клапаціўся аб захаванасці маіх грошай, я, канешне, тыцкала пальцам у неба. Нумар мог быць і ўкраінскі, і літоўскі, і з вострава Бора-Бора. Калі прымаеш званок, бачыш толькі імя, нумар не высвечваецца. Толькі пасля заканчэння размовы ў гісторыі званкоў стаў відаць і нумар. +7... Вось тут вы, галубкі, і пракалоліся. А мне проста пашанцавала ўгадаць. Карацей, нумар гэты я ў чорны спіс адправіла. Праўда, не думаю, што ў іх яшчэ з'явіцца ахвота мне тэлефанаваць.

Але ведаеце, што дзіўна? Пасля гэтай займальнай размовы я цэлы вечар правярала смс-паведамленні — ці не піша мне банк пра спісанне грошай. Было ў голасе таго, хто званіў, нешта такое, чаму вельмі хацелася верыць. І калі б не першапачатковая ўпэўненасць, што гэта «развод» і не пытанне, якое прымусіла махляра абарваць размову, хто ведае, можа, праз хвіліну я ўжо б дыктавала яму рэквізіты сваёй карткі...

Як адна мая знаёмая, якая працуе, скажам так, вельмі блізка ад сферы высокіх тэхналогій. Сітуацыя была падобная: званок увечары праз вайбер, паведамленне ад «службы бяспекі банка» аб спробе невядомых скрасці грошы з карткі. Пастаяннае прыспешванне — маўляў, яшчэ трохі памарудзіце — і вярнуць не атрымаецца. Яна таксама сумнявалася, задавала пытанні. Ёй прапанавалі зайсці па спасылцы, якую яны (!) прышлюць («так хутчэй»), зайсці на старонку банка і пераканацца, што нічто не хлусіць. І яна зайшла на сайт, і ўбачыла лагатып банка і знаёмае афармленне, і «пераканалася», і ўвяла ўсю інфармацыю... І толькі калі ўбачыла, што з карткі зніклі шэсцьсот рублёў — усё, што было, разгледзела: адрас старонкі банка, спасылку на якую ёй дасылалі, мае зусім не беларускі (by), а ўвогуле невядома чый дамен. Прыкладна ў тым жа напрамку зніклі і яе грошы. Засталося толькі здзіўлена пытаць саму сябе: як магла так «павесціся»?

Зрэшты, нічога дзіўнага тут няма. Як і ў любой злачыннай прыбытковай і рызыковай справе, пастаўленай на паток, тут працуюць падрыхтаваныя прафесіяналы. Вішынг (калі адвольна перакладаць з англійскай — рыбная лоўля па тэлефоне) — распаўсюджанае міжнароднае махлярства. Яго ахвяр і ў Беларусі — ужо сотні, калі не тысячы. Прыводзіцца мноства прыкладаў, але, думаю, яшчэ больш застаецца за кадрам, бо многім, як і маёй знаёмай, сорамна прызнавацца, што вось так па-дурному «павяліся»...

Я вось яшчэ думаю пра тое, што для гэтых «рыбакоў»-прафесіяналаў з добра пастаўленымі натрэніраванымі галасамі, з выдатнай псіхалагічнай падрыхтоўкай беларусы — ці не самы лёгкі «ўлоў». Мяркуйце самі: колькі ўжо пра гэты вішынг расказваюць, колькі папярэджваюць, а падманутых ахвяр чамусьці не менее. Асабліва лёгка трапляюць «на вуду» маладыя пенсіянеры. І прычына тут, мне здаецца, менавіта ў нацыянальных асаблівасцях характару. Чалавек, які прычыніўся да высокіх тэхналогій спачатку ў «Аднакласніках», а пасля — праз мабільны банкінг, навучыўшыся аплачваць паслугі, пачынае лічыць сябе сябрам «клуба выбраных». І калі яму звоняць, як ён думае, з гэтага «клуба», замест таго, каб задаваць пытанні і сумнявацца, ён спяшаецца пацвердзіць свой статус, паказаць сваю дасведчанасць. (Бо звоняць жа з банка і па вайберы. А вось каб быў я «дзярэўня», каб не было ў мяне вайбера, дык і спісаліся б мае грошыкі, і ніхто б не папярэдзіў.) І наша звычайная асцярожнасць тут саступае таксама нашаму звычайнаму жаданню быць «не дурнейшым за іншых» і нашай зноў жа звычайнай боязі паказаць сваё няведанне ў нейкім пытанні (хаця што ў гэтым страшнага?). Я думаю, што «рыбакі» ўжо даўно ўсё пра нас зразумелі. Таму і гавораць так нахабна-ўпэўнена, і бяруць нас на «хутчэй-хутчэй» (бо гэта ж толькі «лохі» бескамп'ютарныя будуць марудзіць, а мы ж выдатна ўсё ведаем)...

Мы не такія? Дык і скажыце гэта тым, хто будзе званіць (або пісаць) і настойліва расказваць, як вас спрабуюць падмануць, скажыце, што ў вас ім няма чаго лавіць. Дакажыце гэта ім, але найперш самім сабе.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | **Антикризисный управляющий Открытого акционерного общества «МОТОВЕЛО» – ООО «Антикризисное управление», 220012, Минск, ул. Чернышевского, д. 5, офис 4, сектор «Б»** |
| **Продавец** | **ОАО «МОТОВЕЛО», г. Минск, пр-т Партизанский, 8 (тел. +375 17 298-14-22)** |

**Торги проводятся в форме открытого аукциона отдельными лотами на повышение стоимости с открытой формой предложения**

**Сведения о предмете торгов и начальной цене**

**Дебиторская задолженность:**

Лот № 1: Частное торгово-производственное унитарное предприятие «Бобровник В.В.» (УНП 490907817) на сумму 7 348,43 руб., начальная цена – 5 878,74 руб.
Лот № 2: Жлобинский хлебозавод – Филиал ОАО «Гомельхлебпром» (400173506) на сумму 7 100,00 руб., начальная цена – 5 680,00 руб.
Лот № 3: ИП Крупник Юрий Аркадьевич на сумму 728,30 руб., начальная цена – 582,64 руб.
Лот № 4: Лаврут Сергей Николаевич на сумму 9 029,56 руб., начальная цена – 7 223,65 руб.
Лот № 5: Общество с ограниченной ответственностью «Мосты Радуги» (490614109) на сумму 1 871,39 руб., начальная цена – 1 497,11 руб.
Лот № 6: Частное торговое унитарное предприятие «Чаша счастья» (490980171) на сумму 319,39 руб., начальная цена – 255,51 руб.
Лот № 7: Торговое унитарное предприятие «Гомельская универсальная база» (400058629) на сумму 67 378,53 руб., начальная цена – 53 902,82 руб.
Лот № 8: Общество с ограниченной ответственностью «ГосподарЭкспорт» (191633079) на сумму 2 411,61 руб., начальная цена – 1 929,29 руб.
Лот № 9: Общество с ограниченной ответственностью «ГосподарЭкспорт» (191633079) на сумму 1 449,58 руб., начальная цена – 1 159,66 руб.
Лот № 10: Общество с ограниченной ответственностью «ГосподарЭкспорт» (191633079) на сумму 388,80 руб., начальная цена – 311,04 руб.
Лот № 11: Общество с ограниченной ответственностью «ГосподарЭкспорт» (191633079) на сумму 201,01 руб., начальная цена – 160,81 руб.
Лот № 12: Общество с ограниченной ответственностью «Мила Плюс Принт» (УНП 191803074) на сумму 297,77 руб., начальная цена – 238,22 руб.
Лот № 13: Общество с ограниченной ответственностью «Энерджилайф» (УНП 191446423) на сумму 353,52 руб., начальная цена – 282,82 руб.
Лот № 14: Общество с ограниченной ответственностью «КлинХаус» (УНП 191692668) на сумму 18,00 руб., начальная цена – 14,40 руб.
Лот № 15: Общество с ограниченной ответственностью «КондПартнёрТорг» (УНП 192230897) на сумму 249,41 руб., начальная цена – 199,53 руб.
Лот № 16: Общество с ограниченной ответственностью «Дакор-техногрупп» (УНП 192355221) на сумму 54,00 руб., начальная цена – 43,20 руб.
Лот № 17: Общество с ограниченной ответственностью «Дакор-техногрупп» (УНП 192355221) на сумму 469,20 руб., начальная цена – 375,36 руб.
Лот № 18: Общество с ограниченной ответственностью «КлинСтрим» (УНП 192436934) на сумму 662,40 руб., начальная цена – 529,92 руб.
Лот № 19: Общество с ограниченной ответственностью «КлинСтрим» (УНП 192436934) на сумму 29,40 руб., начальная цена – 23,52 руб.
Лот № 20: Закрытое акционерное общество «Мотовело Интер» (УНП 191690055) на сумму 13,09 руб., начальная цена – 10,47 руб.
Лот № 21: Закрытое акционерное общество «Мотовело Интер» (УНП 191690055) на сумму 36,72 руб., начальная цена – 29,38 руб.
Лот № 22: Закрытое акционерное общество «Мотовело Интер» (УНП 191690055) на сумму 28,95 руб., начальная цена – 23,16 руб.
Лот № 23: Закрытое акционерное общество «Мотовело Интер» (УНП 191690055) на сумму 1 729,20 руб., начальная цена – 1 383,36 руб.
Лот № 24: Закрытое акционерное общество «Мотовело Интер» (УНП 191690055) на сумму 2 216,75 руб., начальная цена – 1 773,40 руб.
Лот № 25: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 9 208,55 руб., начальная цена – 7 366,84 руб.
Лот № 26: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 16 552,92 руб., начальная цена – 13 242,34 руб.
Лот № 27: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 14,40 руб., начальная цена – 11,52 руб.
Лот № 28: Частное торговое унитарное предприятие «Кожедуб И.Н.» (УНП 491039017) на сумму 6 899,41 руб., начальная цена – 5 519,53 руб.
Лот № 29: Частное торговое унитарное предприятие «Контрол-Инвест» (УНП 490440110) на сумму 3 830,25 руб., начальная цена – 3 064,20 руб.
Лот № 30: Частное торговое унитарное предприятие «Супер Мечта» (УНП 490525433) на сумму 5 219,80 руб., начальная цена – 4 175,84 руб.
Лот № 31: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 111 669,00 руб., начальная цена – 89 335,20 руб.
Лот № 32: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 1 844,04 руб., начальная цена – 1 475,23 руб.
Лот № 33: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 11 840,00 руб., начальная цена – 9 472,00 руб.
Лот № 34: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 1 710,00 руб., начальная цена – 1 368,00 руб.
Лот № 35: Закрытое акционерное общество «МВЗ Техно» (УНП 191118373) на сумму 1 058,93 руб., начальная цена – 847,14 руб.
Лот № 36: Закрытое акционерное общество «МВЗ Техно» (УНП 191118373) на сумму 2 431,60 руб., начальная цена – 1 945,28 руб.
Лот № 37: Закрытое акционерное общество «МВЗ Техно» (УНП 191118373) на сумму 700,00 руб., начальная цена – 560,00 руб.
Лот № 38: Частное производственно-торговое унитарное предприятие «Агла-Дар» (УНП 391206762) на сумму 134,40 руб., начальная цена – 107,52 руб.
Лот № 39: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 108 703,09 руб., начальная цена – 86 962,47 руб.
Лот № 40: Закрытое акционерное общество «МВЗ Техно» (УНП 191118373) на сумму 6 749,31 руб., начальная цена – 5 399,45 руб.
Лот № 41: Закрытое акционерное общество «МВЗ Техно» (УНП 191118373) на сумму 734,17 руб., начальная цена – 587,34 руб.
Лот № 42: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 288,00 руб., начальная цена – 230,40 руб.
Лот № 43: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 173 439,86 руб., начальная цена – 138 751,89 руб.
Лот № 44: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 5 534,76 руб., начальная цена – 4 427,81 руб.
Лот № 45: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 359,97 руб., начальная цена – 287,98 руб.
Лот № 46: Общество с ограниченной ответственностью «МВЗ ПромСервис» (УНП 190989976) на сумму 69,60 руб., начальная цена – 55,68 руб.
Лот № 47: Совместное белорусско-австрийское закрытое акционерное общество «Гомельский стеклотарный завод» (УНП 490425175) на сумму 223 688,79 руб., начальная цена – 178 951,03 руб.
Лот № 48: Общество с дополнительной ответственностью «Топаз-люкс» (УНП 490425001) на сумму 387,84 руб., начальная цена – 310,27 руб.
Лот № 49: Закрытое акционерное общество «МВЗ Инпарк» (УНП 191118409) на сумму 183,60 руб., начальная цена – 146,88 руб.
Лот № 50: Закрытое акционерное общество «МВЗ Инпарк» (УНП 191118409) на сумму 400,00 руб., начальная цена – 320,00 руб.
Лот № 51: Закрытое акционерное общество «МВЗ Инпарк» (УНП 191118409) на сумму 3,96 руб., начальная цена – 3,17 руб.
Лот № 52: Закрытое акционерное общество «МВЗ Инпарк» (УНП 191118409) на сумму 873,27 руб., начальная цена – 698,62 руб.
